

ДЗЕЦІ І КАР'ЕРА Ў ВЯЛІКІМ

Сямейная газета

ДЗЯДУЛЯ Ў ДЭКРЭЦЕ

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІПЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 136 (29250)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«У Беларусі прыняты закон аб зваротах грамадзян. Усе службовыя асобы абавязаны праводзіць прыёмы па асабістых пытаннях, сустракацца з людзьмі, чуць іх праблемы і аказваць усялякае садзейнічанне ў іх вырашэнні. Большасць пытанняў падчас такіх прыёмаў, як правіла, датычыцца работы мясцовых уладаў. Хацелася б, каб людзей на месцах чулі і дапамагалі вырашаць пытанні, якія ў іх узнікаюць».*

З першых вуснаў

# «ДЫСЦЫПЛІНА, ВЫКАНАЎЧАЯ І ТЭХНАЛАГІЧНАЯ, СТАБІЛЬНАСЦЬ У ДЗЯРЖАВЕ — ГЭТА АСНОВА ЛЮБОГА РАЗВІЦЦЯ»



Фота БелТА.

### Якія рэформы падыдуць Беларусі і якое будзе новае аблічча краіны — пра гэта расказаў Прэзідэнт актыву Віцебскай вобласці

**За мінулыя два месяцы гэта ўжо другая камандзіроўка Аляксандра Лукашэнкі на Віцебшчыну. Цікавасць кіраўніка краіны да рэгіёна зразумелая: зона крытычнага земляробства, эксперымент па стварэнні аграхолдынгаў... Але размова ў горадзе над Дзвіной ішла не толькі пра сельскую гаспадарку — тэмы падчас падобных сустрэч (кіраўнік дзяржавы ўжо сустракаўся з актывамі Магілёўшчыны, Гродзеншчыны, Брэстчыны, Міншчыны і Мінска) разнастайныя: ад штодзённых праблем рэгіёна да прынцыпова важных для ўсёй краіны.**

СТАР. 2

# І ПОЎНЫ ВАЖКІ СЕНА ВОЗ



Дбайны гаспадар Аляксандр ГАЛКОЎСКІ з вёскі Судзілы Клімавіцкага раёна нарыхтоўваць сена пачынае з першых дзён лета, бо патрэбна яго вельмі шмат.

Разам з жонкай на сваім падворку мужчына (дарэчы, староста вёскі) трымае вялікую гаспадарку: трох кароў і столькі ж цялят, больш як паўсотні авечак, каня, шмат рознай свойскай птушкі.

У час сенакосу на дапамогу прыходзяць дзеці. Траву косяць механізавана, зграбаюць «конскімі» граблямі, копы складаюць дружнай сваяцкай талакой, а возяць духмянае сена дадому на вялікім возе.

Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.

## КОРАТКА

- **Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 18 ліпеня прамыя тэлефонныя лініі.**
- «Белнафтахім» чакае прыбыцця ў Адэсу чарговага танкера з азербайджанскай нафтай у пачатку жніўня.
- **Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў Беларусі ў І паўгоддзі вырасла на 3,7 %.**
- Беларусь далучыцца да пратакола аб абмене падатковай інфармацыяй паміж краінамі СНД.
- **Лаўрэатаў прэміі ўрада ў галіне якасці ўзнагародзілі ў Мінску.**
- Беларускія цукровыя заводы хочуць замацавацца на рынках Афрыкі і Азіі.
- **Эйфелева вежа цалкам адкрылася для турыстаў.**
- Рэсурсны цэнтр бяспекі для дашкольнікаў адкрылі ў Астраўцы.
- **Кубак свету па шахматах сярод жанчын плануюць правесці ў 2021 годзе ў Мінску.**

ISSN 1990 - 763X

Экаэнергетыка

# АЭС як стымул для развіцця электракараў

### Зарадка за чатыры хвіліны і электрасамакаты на сотню кіламетраў

**Трацiна сусветнага аўтапарку да 2040 года стане электрычнай. Беларусы ж да канца 2020-га будуць спажываць на зарадку электракараў энергіі да 12 мільёнаў кВт·г, а ў канцы 2021-га ў краіне запрацуе звыш 600 зарадных станцый. Дадатковы імпульс у гэтым кірунку надасць увод у эксплуатацыю Беларускай АЭС. Такія прагнозы выказвалі ўчора эксперты на Дні электратранспарту, які прайшоў на пляцоўцы індустрыяльнага парка «Вялікі камень».**

СТАР. 3



# «...СТАБІЛЬНАСЦЬ У ДЗЯРЖАВЕ — ГЭТА АСНОВА ЛЮБОГА РАЗВІЦЦЯ»

### «Рэформы не могуць быць усёабдымныя»

Краіна, якая не валодае багатымі прыроднымі рэсурсамі, мае асаблівы шлях і хуткасць развіцця, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «У нас няма вялікіх запасаў вуглевадародаў. У нас няма золата, металу. І нам прыходзіцца выкручвацца, як толькі магчыма... — растлумачыў ён. — ***Нам прыходзіцца выкручвацца, прыстасоўвацца, каб выратаваць сваю краіну і развівацца».***

Віцебшчыну Прэзідэнт назваў сваёй зямлёй, дзе ён нарадзіўся, вырас, таму для яго гэтае месца асаблівае. Але гэта не значыць, што яму аддаецца больш увагі: «Не, вы самі ў гэтым упэўніліся. Можна было і больш для Віцебшчыны зрабіць, улічваючы, што і ў сельскай гаспадарцы — гэта зона крытычнага земляробства... Сам працаваў недалёка, ведаю, што такое пасеяць і ўбраць тут, на поўначы».

Асаблівасці ёсць і ў прамысловасці, бо працоўныя рэсурсы мігрыравалі ў іншыя рэгіёны.

Прэзідэнт паставіў задачу больш рабіць для падтрымкі турыстычнага комплексу ў Віцебскай вобласці. Шмат для станаўлення горада зрабіў яго брэнд — фестываль «Славянскі базар». Турызм, па словах кіраўніка краіны, гэта «бясплатныя грошы», якія прывозяць госці ў рэгіён. ***«Калі ў нас будзе развітая турыстычная галіна, тут і ўвогуле ў краіне, нам не трэба будзе рвацца праз граніцы і вывозіць кудысьці нашу прадукцыю.*** Людзі прыедуць і з'ядуць тут і малако, і мяса, якое на Віцебшчыне навучыліся рабіць», — акцэнтаваў ён.

### «Лагістычная» мара Прэзідэнта

Аляксандр Лукашэнка падчас размовы з актывам Віцебскай вобласці паведаміў, што хоча звязаць сталіцу з Віцебскам і Полацкам больш сучаснай дарогай праз Бягомль.

«Я вельмі б хацеў, каб мы з Мінска на Полацк і Віцебск пабудавалі дарогу. Я даручыў, каб гэты праект ужо зрабілі, і каб ён ляжаў у нас на стале і ў патрэбны момант (гэта адзіная мая вялікая мара) каб з Мінска праз Бягомль ажыццявілі будаўніцтва гэтай дарогі», — сказаў Прэзідэнт.

Пакуль для гэтага праекта час не надышоў — няма эканамічнай неабходнасці, не будзе загрузкі для акупнасці. Месцамі дарогу ўжо пачалі прыводзіць у парадак, за некалькі гадоў адновяць і дабудуюць да чатырох палос.

### Пра нафту, пандэмію і сяброўства

Завод «Нафтан» кіраўнік краіны ахарактарызаваў як «адзін з флагманаў беларускай нафтаперапрацоўкі». Па яго словах, як і на іншыя «смачныя кавалкі нашай эканомікі», на завод прэтэндавалі і сёння таксама прэтэндуюць ахвотныя яго купіць.

***«Гэта прадпрыемства для нас стратэгічнае. Гэта экспарт, гэта валютная выручка, пытанне эканамічнай бяспекі краіны.*** Таму натуральна, сёння ніякай размовы не можа быць аб прыватызацыі гэтага прадпрыемства», — заявіў Прэзідэнт.

У бягучай пяцігодцы праведзеная рэканструкцыя тэхналагічных установак на «Нафтане». Краіна сама знаходзіць грошы і паступова праводзіць мадэрнізацыю, каб вывесці завод на самы высокі ўзровень.

Асаблівая ўвага аддадзена ў рэгіёне аб'ектам аховы здароўя. Менавіта Віцебшчына разам з Мінскам першымі сутыкнуліся з праблемай каранавіруса. Прэзідэнт падзякаваў урачам і кіраўніцтву рэгіёна за напрацоўкі для ўсёй краіны па лячэнні ковід-хворых.

Па словах Прэзідэнта, Віцебск — цэнтр славянскай культуры, які быў і застаецца мостам паміж брацкімі народамі Беларусі і Расіі. «У нас няпростыя часы ў адносінах з Расіяй, але павінен вам сказаць, мы гэта пераадолеем. Нам наканавана жыць разам. Не могуць расіяне без беларусаў, а беларусы без Расіі. Нам наканавана і гісторыяй, і сённяшнім днём», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Давядзём да розуму і запусцім першы, а затым другі блок АЭС — нам ніхто не перашкодзіць гэта зрабіць», — паведаміў Прэзідэнт і дадаў, што жыць у міры неабходна з усімі суседзямі, але менавіта пазіцыя Літвы ў дачыненні да БелАЭС стала праблемай у адносінах з гэтай краінай.

«Лічу пастаноўку пытання не проста палітызаванай, а неразумнай», — сказаў ён.

АЭС будуюцца ва ўсім свеце, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Сёння на планеце функцыянуе больш за 200 станцый, якія даюць 12 % электраэнергіі.

«Увесь свет пераходзіць на электрычную энергію, — сказаў Прэзідэнт. — Да таго ж, атамная станцыя — гэта самыя высокія тэхналогіі, імкненне нашай краіны ў будучыню, абсалютна іншае яе аблічча».

### Намёкі не ў той бок

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь напярэдадні выбараў апынулася ў сітуацыі, калі заходнія краіны адносяцца да нас з пазіцыі двайных стандартаў. «Яны ўжо нам пачынаюць намякаць: вы глядзіце, каб усё было дэмакратычна, каб, не дай бог, на вуліцы не было сутыкненняў», — паведаміў ён.

Пры гэтым ніхто не крытыкуе Францыю за падаўленне «жоўтых камізэлек», ЗША — за выкарыстанне слёзатачывага газу. «Вы пакрытыкуйце Трампа, пакрытыкуйце ЗША за адсутнасць дэмакратыі, на Расію паспрабуйце наехаць! Пабойваюцца. І вось яны, мабыць, вырашылі патрэніравацца на Беларусі. Не атрымаецца. ***Мы сваю краіну будзем абараняць усімі законнымі метадамі. Незаконна ніхто нічога рабіць не будзе. Але сваю краіну мы нікому не аддадзім»,*** — сказаў Прэзідэнт.

У ахвотных была магчымасць зарэгістравацца назіральнікамі на выбарах, заўважыў ён, але «не трэба паказваць пальцам, як нам жыць». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, прадузятай увагай да Беларусі некаторыя краіны прыкрываюць свае ўнутраныя праблемы.

Разам з тым, на думку кіраўніка краіны, у заходніх партнёраў ёсць чаму вучыцца — развіццю бізнесу, выкарыстанню новых тэхналогій, і мы гэтаму паспяхова вучымся.

### Рэгіёны для жыцця

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што без вёскі не бывае славянства і «жыватворныя карані» трох народаў — беларусаў, расіян і ўкраінцаў — адтуль.

«Нашы бацькі, дзяды, яны адтуль — ад зямлі. Нельга загубіць свае карані, знішчыць вёскі. Аб гэтым я гаварыў чвэрць стагоддзя таму, — нагадаў ён. — ***Мы выратавалі вёску — значыць ёсць дзяржава. Не было б вёскі — не было б дзяржавы».***

Прэзідэнт нагадаў віцебскаму актыву, што распрацаваны праграмы развіцця малых і буйных гарадоў краіны. Пачалі з Оршы, якая стала прыкладам для іншых. «Прашу мець на ўвазе, што за выкананне гэтых праграм спытаем вельмі сур'ёзна,— звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — ***І будучая пяцігодка прысвечана малой радзіме. Нам трэба падняць рэгіёны, каб людзі ў аграгарадку адчулі сябе, як у Мінску».***

### Думаць на гады наперад

Прэзідэнт пазначыў, што неабходна не проста сабраць ураджай, але і стварыць рэзерв па хлебе ў Віцебскай вобласці.

«Чаго б нам ні каштавала. Неабходна актывізавацца, нягледзячы ні на якія выбары ўбраць хлеб. Выбары скончацца, 9 жніўня дакладна. Есці неабходна будзе і пасля 9-га. Нельга страціць гэты год. Для Віцебшчыны ён вельмі паказальны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Віцебскую вобласць ён арыентаваў на заснаванне ў будучай пяцігодцы інавацыйнага прадпрыемства. Гэта патрабаванне да кожнага рэгіёна. Прыкладам айчынных рэформаў можа стаць і развіцьцё базавых вытворчасцяў Беларусі.

***«Мы павінны стаць на плечы нашых прадпрыемстваў-гігантаў і развівацца далей. Нельга нічога разбураць,*** — запатрабаваў Прэзідэнт. — ***Наша рэформа — гэта паглыбленне таго працэсу вытворчасці, які мы сёння маем».***

Адзін з асноўных пасылаў — без строгай выканаўчай і тэхналагічнай дысцыпліны ўсе планы пойдуць прахам.

«Дысцыпліна, выканаўчая і тэхналагічная, стабільнасць у дзяржаве — гэта аснова любога развіцця. Ніякія «майданы» і рэвалюцыі нас не выратуюць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА, *г. Віцебск.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «МЫ НІЧЫМ НЕ ЎТРЫМАЕМ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ, КАЛІ НЕ БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ НАРМАЛЬНУЮ ЗАРПЛАТУ»

## Прэзідэнт адкрыў адноўлены Полацкі пуцеправод у Віцебску

**Значная частка рабочага тыдня кіраўніка дзяржавы праходзіць на поўначы краіны. У парадку двух дзён на Віцебшчыне — пытанні і палітычныя, і культурныя, і інфраструктурныя. Адзін з пунктаў візіту ў абласным цэнтры — адноўлены пуцеправод.**



Фота БелТА.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў і генеральны дырэктар ААТ «Мастабуд» Сяргей Вашкевіч далажылі кіраўніку дзяржавы аб ходзе будаўніцтва моста, а таксама праблемных участках горада: развязцы і кальцы вакол Віцебска.

Мікалай Шарснёў звярнуў увагу на ўчастак вуліцы Гагарына, на мадэрнізацыю якога амаль хопіць сэканомленых пры рэканструкцыі пуцеправода грошай.

«Да наступнага «Славянскага базару» і прымем, запрасім», — абазначыў адрасу тэрміны кіраўнік краіны.

### Помнік на стагоддзі

Па новым мосце Прэзідэнт праехаў у трамваі. Па рэйках, пакладзеных па еўрапейскай тэхналогіі, трамвай ідзе мякка, заўважылі пасажыры.

Аляксандр Лукашэнка, перарэзаўшы чырвоную стужку, урачыста адкрыў адноўлены пуцеправод. «Уяўляю, якая была бяда ў Віцебску, калі гэтага пуцеправода не было, быў стары. Якая была праблема, калі стары пуцеправод закрылі на паўтара года і пачалі будаўніцтва гэтай развязкі. Пагадзіцеся, што без гэтага цуда-збудавання Віцебск існаваць не мог. І далей было б горш і горш», — звярнуўся да мастабудаўнікоў і гараджан лідар.

Вельмі своечасовае адкрыццё дарогі напярэдадні «Славянскага базару».

Прыедуць госці з замежжа, з Беларусі і ўбачаць сучасны, прыгожы горад. Вельмі сучасная, вельмі прыгожая, вельмі зручная атрымалася развязка. ***Гэта помнік на стагоддзі, які мы пакідаем нашаму славянскаму гораду.*** Гэта найважнейшая дарога, і мы яе зрабілі. А значыць, для жыхароў Беларусі, для нашых гасцей наш Віцебск стаў яшчэ больш прывабны», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

У панядзелак, адкрываючы мост цераз раку Сож у Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў найбліжэйшыя тры гады будуць рэканструяваныя і мадэрнізаваныя 18 буйных мастоў, а да канца пяцігодкі — каля сарака невялікіх. Так што работа ў маставікоў і будаўнікоў у Беларусі будзе. Галоўнае — забяспечыць годную зарплату.

***«Мы нічым не ўтрымаем нашых людзей тут, у Беларусі, калі не будзем плаціць нармальную зарплату. Будаўнікі — малайцы, яны ж працуюць у любое надвор'е. Добра, што мы захавалі нашы калектывы мостабудаўнікоў — далёка не кожная краіна можа пабудаваць мост. Мы гэта ўмеем рабіць.*** Калі за паўтара года ствараюць такія помнікі — гэта дарагога варта», — падзякаваў Прэзідэнт.

### Іспыт вытрымалі

Аляксандр Лукашэнка падтрымаў рашэнне аб будаўніцтве кальцавой дарогі вакол Віцебска — ён упэўнены, што трэба выключыць праезд транзітнага транспарту праз горад. І такое пажаданне ён выказаў адносна ўсіх беларускіх гарадоў.

Пра гэта казалі і самі работнікі ААТ «Мастабуд». Прадстаўніца калектыву падзякавала кіраўніку дзяржавы за ўвагу да развіцця дарожнай інфраструктуры, магчымасць будаўнікам працаваць на радзіме, і асобна — за падтрымку стварэння паўночна-заходняга абходу Віцебскай кальцавой аўтадарогі.

***«Такія маладыя людзі непакояцца аб паўночна-заходнім абходзе, пуцеправодах — значыць, у нас, у нашай нацыі ёсць будучыня»,*** — пахваліў Аляксандр Лукашэнка. Ён запэўніў: на праект грошы знойдуцца, і паабяцаў рэалізаваць яго ў наступную пяцігодку.

Мікалай Шарснёў нагадаў, якую рэзалюцыю паставіў на лісце з просьбай аб падтрымцы рэканструкцыі Полацкага пуцеправода паўтара года таму Прэзідэнт: «Думайце пра людзей». Дзякуючы гэтаму фінансаванне ішло без перапынку, добра спрацавалі праектанты, не падвялі будаўнікі.

«Любыя прэзідэнцкія выбары (акрамя таго, што да 7 лістапада мы заўсёды народу падарункі робім у выглядзе новых пабудоў, у асноўным) — гэта іспыт. Не я буду здаваць экзамен — я таксама, але больш за ўсё вы (кіраўніцтва Віцебшчыны. — **Зв.**). Што тут дрэннага? Напэўна, прэзідэнцкія выбары нас моцна падагналі, і мы хацелі нешта зрабіць віцябчанам, каб яны добрае слова сказалі пра нас. Гэты іспыт маставікі вытрымалі, і губернатар таксама», — даў ацэнку Аляксандр Лукашэнка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# АЭС як стымул для развіцця электракараў



## Чысты, надзейны, камерцыйны

Стымуляванне выкарыстання электратранспарту, развіццё электразараднай інфраструктуры і, адпаведна, павышэнне камфорту пражывання ў гарадах — на ўсё гэта скіраваны не толькі сілы спецыялістаў галіны энергетыкі, але і шэраг адпаведных указаў Прэзідэнта, у прыватнасці Указ № 92 аб стымуляванні выкарыстання электрамабіляў, які прадугледжвае льготы для ўладальнікаў электракараў і арганізацый, што іх абслугоўваюць.

— Атамная станцыя — гэта надзейная і чыстая крыніца энергіі, якая стымулюе развіццё не толькі электратранспарту, але і ўкараненне новых тэхналогій у іншых галінах: навуцы, медыцыне, прамысловасці. Электратранспарт — гэта зніжэнне шкодных выкідаў, аздараўленне гарадскога асяроддзя і павышэнне бяспекі на дарогах, — падкрэсліў **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ.**

Абнаўленне транспартнага парку сучасным, высокабяспечнай і экалагічнай тэхнікай — важны элемент устойлівага развіцця нашай краіны. Цудоўна, што айчынныя прадпрыемствы паэтапна пашыраюць мадэльны рад электратэхнікі, упэўнены **Анатоль ІСАЧАНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, нацыянальны каардынатар па мэтах устойлівага развіцця (МУР)**:

— У Беларусі вядзецца сістэмная работа па ўкараненні аўтаматызаваных сістэм кіравання перавозачным працэсам, павышэнні ўзроўню інфарматызацыі транспартнага комплексу, пашырэнні электрыфікацыі чыгункі і павелічэнні долі электратранспарту. Усё гэта з'яўляецца асновай канцэпцыі «разумных» гарадоў, якую мы развіваем. Паўсюднае ўкараненне зялёных тэхналогій, якія грунтуюцца на энерга- і рэсурсазберажэнні, забяспечваюць развіццё эканомікі без шкоды для экалогіі. Гэта адна з задач МУР.

Больш за 80 электробусаў сёння ездзяць па гарадскіх маршрутах. Тэрмін іх эксплуатацыі разлічаны на 15 гадоў, і за адну зарадку такі транспарт здольны прайсці да 300 кіламетраў. МАЗ у найбліжэйшы час павінен выпусціць каля 20 адзінак тэхнікі, а на МТЗ распрацавалі і выпусцілі машыну для заліўкі лёду, якая цяпер выпрабоўваецца на лядовых арэнах.

— Трэба разумець, што электрамабіль — больш ёмістае паняцце, чым проста аўтатранспарт, — падкрэсліў **Андрэй БУЙНЕВІЧ, намеснік міністра прамысловасці.** — Гэта комплексная інфраструктура зарадных станцый, інфраструктура спецыялізаваных станцый тэхнічнага абслугоўвання, навучанне спецыялістаў, якіх трэба рыхтаваць, каб развіваць гэты кірунак надалей. Вялікая перспектыва бачыцца і ў развіцці камерцыйнага аўтатранспарту.

## Аўтобусы-беспілотнікі і суперхуткасная зарадка

Дзень электратранспарту ўпершыню праходзіць у «Вялікім камені», і гэта сімвалічна, лічыць **кіраўнік адміністрацыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка Аляксандр ЯРАШЭНКА:**

— Менавіта тут першай арганізаванай вытворчасцю стаў выпуск суперкандэнсатараў рэзідэнтам «Чэнду Сіньджу Шаўковы Шлях Развіццё», якія цяпер эксплуатуюцца ў транспарце вытворчасці Белкамунмаша. Цяпер у парку 62 рэзідэнты з 15 краін, высокія тэхналогіі і новая індустрыя — кірункі, якія мы тут развіваем.

На імправізаванай выставачнай пляцоўцы журналісты і наведвальнікі на свае вочы пабачылі навінкі электратранспарту, якія ўжо выпускаюцца ў краіне, пачынаючы эксплуатавацца ў Беларусі, а таксама толькі пачнуць ствараца. Прынамсі, літаральна месяц таму «Вялікі камень» прыняў да сябе рэзідэнта з Літвы, які будзе выпускаць электрасамакаты, здольныя праходзіць на адной зарадцы больш за 100 кіламетраў. Для айчынных спажыўцоў стануць даступныя таксама зарадныя прылады і пракат такога транспарту.

Ганаровыя госці праехалі па тэрыторыі на беспілотным аўтобусе, які прэзентавалі на свяце. Экатранспарт са штучным інтэлектам неўзабаве будзе хадзіць па тэрыторыі парка, а ў будучым «Вялікі камень» стане экалагічна чыстым горадам, дзе будзе рухацца толькі электратранспарт, прычым беспілотны, выказаў спадзяванне Аляксандр Ярашэнка.

— На працягу апошніх 20 гадоў галіна аўтамабілебудавання змяняецца. Машыны, якія працуюць на бензіне і дызелі, паступова саступаюць месца гібрыдным аўто і электракарам. І развіццё электратранспарту на новых крыніцах энергіі мае ў Беларусі вялікую будучыню, — спадзяецца **Янь Ган, генеральны дырэктар Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».** — XXI стагоддзе — эпоха новых энергарэсурсаў. Беларусь — адна з асноўных краін-імпарцёраў энергарэсурсаў у ЕАЭС, і прасоўванне новых крыніц энергіі і іншых галін зялёнай эканомікі несумненна будзе садзейнічаць эканамічнаму развіццю краіны ў будучыні.

Ён паабяцаў прыцягваць яшчэ больш прадпрыемстваў з Кітая, Еўропы і Амерыкі для стварэння прамысловых ланцужкоў першасных і другасных сектараў па вытворчасці аўто на новых крыніцах энергіі, каб з'явіліся спрыяльныя ўмовы для выпуску беларускіх электрамабіляў.

Беларусь у плане развіцця электрычнай інфраструктуры можа лічыцца сусветным лідарам, бо тут на кожную зарадную станцыю прыходзіцца ледзь не па адным электракары. Прытым што ў Нарвегіі на адну станцыю — 14 аўто, ва Украіне — каля дзясятка, падзяліўся назіраннямі **Андрэй КОЦІК, намеснік генеральнага дырэктара кампаніі «Беларуснафта»**, якая з'яўляецца нацыянальным аператарам зараднай інфраструктуры краіны:

— У 2014 годзе мы паставілі першыя зарадныя станцыі, у 2018-м у краіне іх было 17. Сёлета плануецца паставіць дадаткова яшчэ 180 прылад, прычым гэта будуць хуткія зарадныя станцыі, якія дазволяць літаральна за паўгадзіны зарадзіць аўто на сотню і больш кіламетраў. Да канца 2021 года ў Беларусі будзе больш як 600 зарадных станцый. Актыўна развіваем ідэю суперхуткасных зарадных комплексаў, якія будзем усталёўваць з 2022 года. На іх за чатыры хвіліны можна будзе зарадзіць аўто на 200—300 кіламетраў. Цяпер адлегласць паміж зараднымі станцыямі на трасах — 120—150 кіламетраў. На магістралях магутнасць станцый у асноўным па 150—180 кВт, а ў гарадах — па 50, і яны знаходзяцца каля гандлёвых і забаўляльных цэнтраў.

У краіне цяпер каля 500 электрамашын, а зарадных станцый, на якіх можна падзарадзіць да дзевяці тысяч аўто, — 260. Неўзабаве зарадная інфраструктура краіны зможа абслугоўваць да 35 тысяч электракараў, абяцаюць спецыялісты.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На слыху

# СПРАБАВАЛІ СПРАВАКАВАЦЬ БОЙКУ З МІЛІЦЫЯЙ

### У Мінскім ГУУС пракаментавалі падзеі, якія адбываліся ў сталіцы ўвечары 14 ліпеня

**Начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ адзначыў, што 14 ліпеня «на розных інтэрнэт-рэсурсах, як ужо вядома, з'явілася інфармацыя, а больш канкрэтна, з'явіліся заклікі сабрацца ў цэнтральнай частцы горада для правядзення несанкцыянаванага масавага мерапрыемства».**

Пачынаючы з 19.00 у цэнтральнай частцы горада — ад плошчы Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа і на пр. Незалежнасці да стэлы, а таксама на пр. Дзяржынскага — пачалі збірацца арганізаваныя групы, якія выстройваліся ў ланцужкі. «Сваімі дзеяннямі перашкаджалі руху пешаходаў, а таксама спрабавалі пад выглядам пешаходаў пераходзіць пешаходныя пераходы, у асноўным нерэгулюемыя, перашкаджаць руху транспарту. Супрацоўнікамі органаў унутраных спраў праводзілася растлумачальная работа аб парушэнні дзеючага заканадаўства, а менавіта — закона аб масавых мерапрыемствах, — растлумачыў Іван Кубракоў. — З 19.00 да 00.00 у вышэйназваных месцах сабралася каля дзвюх тысяч грамадзян». Супрацоўнікі міліцыі працягвалі растлумачальную работу, многія грамадзяне, па словах начальніка міліцыі, прынялі гэта да ўвагі ды пачалі разыходзіцца.

«Аднак асобныя групы пачалі зноў выстройвацца ў ланцужкі, збірацца ў арганізаваныя групы, перашкаджалі руху як пешаходаў, так і транспарту. Станавіліся каля праезнай часткі, выкрыквалі розныя лозунгі, тым самым правакуючы кіроўцаў, якія пачыналі сігналіць», — расказаў Іван Кубракоў.

Нягледзячы на растлумачальную работу, «многія грамадзяне на яе не рэагавалі, спрабавалі справакаваць бойку з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў». «Было прынята рашэнне аб спыненні такіх правапарушэнняў, а таксама аб затрыманні актыўных удзельнікаў. Многія з іх аказалі актыўнае непадпарадкаванне супрацоўнікам органаў унутраных спраў. Большасць з іх была дастаўлена ў тэрытарыяльныя падраздзяленні ўнутраных спраў», — праінфармаваў начальнік ГУУС.

«У дачыненні да 115 грамадзян, якія актыўна ўдзельнічалі ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, аказвалі непадпарадкаванне законным патрабаванням праваахоўнікаў, цяпер складзеныя адміністрацыйныя пратаколы за парушэнне закона аб масавых мерапрыемствах, а таксама аб непадпарадкаванні законным патрабаванням супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Усе матэрыялы накіраваныя ў суды горада Мінска. Будзе давацца ацэнка дзеянням такіх асоб», — паведаміў Іван Кубракоў.

Ён дадаў: у інтэрнэце з'яўлялася інфармацыя аб тым, што міліцыя затрымлівае мінакоў. «Хачу растлумачыць, што супрацоўнікамі органаў унутраных спраў былі прынятыя ўсе неабходныя меры для растлумачэння дзеючага заканадаўства», — дадаў Іван Кубракоў. Ён заўважыў, што 14 ліпеня на розных інтэрнэт-рэсурсах і на сайце МУС была размешчана інфармацыя аб тым, што міліцыяй будзе дадзена прававая ацэнка заклікам да несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў, а таксама пра тое, што будуць прынятыя ўсе меры для аховы грамадскага парадку.

Іван Кубракоў падкрэсліў: на месцы супрацоўнікі міліцыі тлумачылі сітуацыю тым, хто проста гуляў. Многія ставіліся з разуменнем, але многія і абураліся, таму што з-за мітынгу даводзілася пераходзіць на другі бок дарогі.

«Пры спыненні незаконных дзеянняў грамадзян, якія сабраліся ў арганізаваныя ланцужкі, многія з іх аказвалі актыўнае непадпарадкаванне. А менавіта — нанасілі ўдары супрацоўнікам органаў унутраных спраў», — паведаміў начальнік ГУУС. Паводле яго слоў, супрацоўнікі міліцыі былі праяўлена стрыманасць.

«Акрамя 115 чалавек, у дачыненні да якіх былі складзены пратаколы, намі праводзіцца мерапрыемствы па ўстанаўленні ўсіх правапарушальнікаў. Усе будуць прыцягнуты да ўстаноўленай законам адказнасці», — адзначыў начальнік ГУУС. Ён нагадаў, што УСК па Мінску была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 342 КК, а падчас учарашніх падзей пацярпелі шэсць супрацоўнікаў міліцыі, чацвёра з іх шпіталізаваныя.

«У асноўным шпіталізаваныя тыя, у каго былі траўмы на твары, на галаве», — растлумачыў Іван Кубракоў.

Ён таксама паведаміў, што ўсе затрыманыя — грамадзяне Беларусі. Яны не толькі з Мінска, ёсць іншагароднія. Сярэдні ўзрост — ад 14 да 30 гадоў. Сярод іх ёсць тыя, хто ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці.

Іван Кубракоў заўважыў, што групы канцэнтраваліся ў пэўных месцах: «Было бачна, што ёсць мадэратары, якія кіруюць менавіта гэтымі групамі. Хутчэй за ўсё, праз інтэрнэт. Відаць, што ішлі заклікі да вызначанага месца. Гэта значыць кіравальнасць гэтых груп была бачная». Затрымліваліся і веласіпедысты, якія далучаліся да груп і ехалі па пешаходнай зоне.

«Было бачна, што гэтыя групы і такая колькасць людзей не проста так пачыталі і прыйшлі. Гэта, вядома, кіраваныя групы, якія заклікалі прыйсці менавіта сюды. Як, чаму — гэта ўжо будзе высветлена і падчас адміністрацыйнага працэсу, а таксама, у першую чаргу, напэўна, пры расследаванні крымінальнай справы», — сказаў Іван Кубракоў.

**Паводле БелТА.**

# Фотапастка здыме непрыкметна

**Другі год запар ліпень складваецца халаднейшы за чэрвень. Адбіваецца гэта і на пажарнай абстаноўцы ў лясах. Калі ў чэрвені ў «чырвонай зоне» апынулася амаль 40 раёнаў Беларусі, то цяпер іх усяго тры — Гомельскі, Добрушскі і Брагінскі. Але агульная статыстыка ўзгаранняў пакуль застаецца трывожнай.**

— Па стане на 14 ліпеня на тэрыторыі ляснога фонду адбылося больш за 800 лясных пажараў, іх агульная плошча склала крыху больш за 6,5 тысячы гектараў. І ў пераважнай большасці выпадкаў віна ляжыць не на прыродзе, а на чалавеку, — адзначыў **начальнік упраўлення лясной гаспадаркі Мінлясгаса Сяргей ЧАРНЯЎСКІ.** — За мінулыя выхадныя было зарэгістравана толькі тры ўзгаранні, ахопленая імі тэрыторыя невялікая — крыху менш за паўгектара.

У лесе вельмі важна засекчы пажар на як мага ранейшай стадыі. Гэта звязана не ў апошнюю чаргу з тым, што да ачага бывае вельмі няпроста дабрацца. Таму больш за шэсць соцень спецыяльных назіральных вышак абсталявана сістэмай відэаназірання, дзякуючы якой можна хутчэй скіраваць туды спецыяльныя групы для лакалізацыі і тушэння.

— З пачатку года Дзяржаўная лясная ахова прыцягнула да адказнасці 454 чалавекі за парушэнне правіл пажарнай бяспекі ў лясах, — паведаміў Сяргей Чарняўскі. — У тым ліку — і дзякуючы сістэме відэаназірання ў масівах. Менавіта пры дапамозе фотапастак удалося знайсці 140 парушальнікаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Пасля ўрагану

# ТАЛАКА НА БУРАЛОМЕ

## Ліквідацыяй наступстваў стыхіі на Маларыччыне займаюцца ўсёй грамадой, на дапамогу вяскоўцам выязджаюць гараджане

**Стыхія абрынулася на паўднёвыя раёны Брэстчыны вечарам 6 ліпеня. Найбольш моцна навальнічны фронт зачапіў Маларыцкі раён. Пацярпелі жылыя дамы, гаспадарчыя пабудовы, аб'екты сацкультбыту, могілкі, дзясяткі гектараў лесу. Лес паламала і спляжыла палосамі. Зверху асобныя лясныя дзялянкі нагадваюць вытаптанае вандаламі поле. Напрыклад, 30—40-гадовыя сосны на вышыні трох-чатырох метраў пераламала нібы танюткія запалкі. Бярозы ды іншыя дрэвы вывернула з карэннем і зямлёй, ад іх засталіся варонкі, як ад выбуху бомбы. Якой сілы спатрэбілася б тэхніка, каб хто задумаў так выдраць з зямлі дрэва, нават уявіць цяжка...**



### Шыфер разгружалі да ночы

Могілкі ў Велікарыце аказаліся пад заваламі дрэў, двор школы пасля ўрагану нагадваў лясны бурелом. У Пажэжыне вецер сарваў купал з царквы, яго аднесла метраў на 30 ад будынка. Найбольш дамоў і гаспадарчых пабудоў пацярпела у Масявічах, Велікарыце, Печках. Работа па ліквідацыі наступстваў пачалася адразу на наступны дзень.

— Дах разрывала поўнасцю альбо часткова са 150 дамоў і гаспадарчых пабудоў — расказаў **старшыня Велікарыцкага сельскага Савета Віктар КІРЫЧУН**. — Першае адрэагавала райспажыўтаварыства. Аператыўна завезлі ўсе будаўнічыя матэрыялы. Шыфер і цвікі разгружалі амаль да ночы. І адрамантаваць стрэхі ўдалося літаральна за некалькі дзён. На прыватных падворках з рамонтам людзі ў асноўным спраўляліся сваімі сіламі. Шматкватэрныя і аднакватэрныя дамы ААТ «Рыта» рамантавалі спецыялісты сельгаспрадпрыемства. На дапамогу вяскоўцам прыйшлі мужчыны з рэабілітацыйнага цэнтра, які функцыянуе ў Велікарыце. Яны, дарэчы, дапамаглі паправіць дах на будынку сельвыканкама, які таксама пацярпеў.

— Сумнае відовішча ўяўляюць сабой могілкі пасля ўрагану — працягвае Віктар Мікалаевіч. —



Паваленыя дрэвы ў многіх месцах пашкодзілі помнікі, агароджы. Увіце сабе векавую сасну, нанізаную на штыр агароджы!.. Такую карціну засталі назаўтра пасля стыхіі. Расчыстку завалаў мы ўжо заканчваем. А вось наконт помнікаў — зараз вядзецца работа па ўліку пашкоджаных. Старасты вёсак абыходзяць людзей, збіраюць звесткі. Грамадзяне пішуць заявы ў сельвыканкам, прыкладаюць фота. Спачатку правядзём улік, а потым будзем вырашаць, якую дапамогу можна аказаць людзям па аднаўленні помнікаў — паведаміў старшыня.

— Работа вядзецца па ўсіх кірунках. Шмат дапамаглі гараджане. У суботу да нас прыехала каля ста чалавек з усіх арганізацый і ўстаноў раёна на чале з кіраўніцтвам райвыканкама. Працавалі на школьным двары, які завалілі дрэвамі, на могілках, на вясковых вуліцах побач з помнікамі ваенным падзеям. Апошнія, дарэчы, не зачапіла: вакол зваленыя дрэвы, а помнік стаіць цэлы. Як і купал царквы, што аднесла ад будынка: калі б ён упаў на дах храма, будынак быў бы знішчаны, гэта ж не смешкі — 10 тон.



### Высякаюць спрэс і выбарачна

Актыўна працуе па ліквідацыі наступстваў урагану і Маларыцкі лясгас. Ёсць спляжаныя ўчасткі ў Велікарыцкім, Гвозніцкім, Чарнянскім, Пажэжынскім лясніцтвах. Паводле слоў **галоўнага ляснічага Маларыцкага лягаса Васіля ПЯТРУЧЫКА**, на 70 гектарах трэба высекчы лес спрэс, і на 200 гектарах — выбарачна. Зараз працуюць 30 вальшчыкаў лесу. З тэхнікі задзейнічаны «Харвестар», цялежкі МПТ для вывазкі драўніны, трактары.

Час праспешвае, бо мёртвая драўніна вельмі хутка псуецца. З кожным днём дзелавой драўніны будзе станавіцца менш і расці колькасць тых дрэў, якія годныя толькі на дровы. Як вядома, лес нарыхтоўваюць зімой, калі дрэва знаходзіцца амаль у закансерваваным стане. А калі яго зваліць у час руху соку, яно хутка сінее на зрэзе, а гэта сігнал таго, што на якую-небудзь вытворчасць такое бярвенне непрыгоднае. Таму лесаводы і спяшаюцца.

А калі правядуць нарыхтоўку драўніны, вывазку, ачыстку дзялянак, прыкладна ў лістападзе падрыхтуюць глебу для пасадкі новых лясных культур. Што датычыцца лесу, то наступствы стыхіі, якая бушавала 20 хвілін, можна будзе назваць пераадоленымі праз дзясяткі гадоў, калі вырасце новы лес.

### Усёй грамадой

Хоць і сваёй работы многа на лясных дзялянках, у суботу асобныя вальшчыкі лесу працавалі з прадстаўнікамі іншых арганізацый на суботніку на тэрыторыі школы. Бо там атрымаўся такі буралом, што людзям без спецыфічных навыкаў і сродкаў індывідуальнай аховы нельга было прыступаць. Самыя небяспечныя дрэвы распілавалі і прыбралі па ўсіх правілах спецыялісты, астатнія завалы прыбіралі валанцёры з тых, хто прыехаў на суботнік.

— На гэтай рабоце найбольш патрабавалася мужчынская сіла — падзяліўся ўражаннямі пра суботнік **старшыня раённага Савета дэпутатаў Алег ЯКУБЧЫК**. — На могілках дрэвы трэба было выносіць толькі ўручную, чым мы і займаліся з работнікамі газавай гаспадаркі, ЖКГ, іншых арганізацый. Работа знаходзілася для ўсіх. І кіраўніцтва раёна вельмі ўдзячнае тым, хто адклікнуўся. Той выпадак, калі людзям трэба дапамагаць усёй грамадой. Папрацавалі некалькі гадзін — і тэрыторыю школы стала не пазнаць, прыкладна такая ж карціна з іншымі пляцоўкамі. У гэтую суботу запланавалі яшчэ адзін суботнік, зноў кінулі заклік на прадпрыемствы і арганізацыі раёна, былі б рады, калі б знайшліся ахвотныя на добрую справу і з абласнога цэнтра.

— Самае галоўнае, што стыхія нанесла толькі матэрыяльны ўрон, ніхто з людзей не пацярпеў — зноў уступае ў гаворку кіраўнік мясцовай улады Віктар Кірычун. — Урон мы падлічым і паступова ліквідуем наступствы стыхіі, падобнай якой і старажылы не прыпомняць. Людзі, якіх ураган застаў у машынах, расказвалі, што сядзелі і дрыжалі, было такое ўражанне, што машыну зараз падніме і пераверне альбо панясе некуды. А назаўтра ранкам, калі развіднела, мы не пазнавалі свае вёскі, гэта было нібы ў фільмах жахаў, калі яны паказваюць наступствы невялікага ядзернага ўдару. І яшчэ раз узнікала адчуванне палёгкі, што ўдалося пазбегнуць ахвяр. А ў парадак нашы вёскі паціху прывядзём. Ужо і цяпер многае памянялася, пасля суботніка стала лепш, пасля другога, спадзяёмся, застанецца яшчэ менш завалаў. Ды і самі жыхары вёсак шмат робяць, кожны расчышчае хоць невялікую тэрыторыю каля свайго падворка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**
*Маларыцкі раён.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Рынкі пайшлі ўверх на фоне паспяховых выпрабаванняў вакцыны ад COVID-19



Аптымістычны тон задала Азія — індэкс MSCI вырас на 1,2 % і ўшчыльную падабраўся да пяцімесячнага піка, Nikkei вырас на 1,5 %. Больш сціпла адрэагаваў на навіны аб выпрабаваннях вакцыны, распрацаванай кампаніяй Moderna Inc. (вакцынацыя двума дозамі эксперыментальнай вакцыны выклікала пажаданы імунны эфект ва ўсіх 45 добраахвотнікаў, якія ўдзельнічаюць у выпрабаваннях), кітайскі рынак. Так, індэкс блакітных фішак CSI300 падрос на 0,3 %. Ход выпрабаванняў вакцыны справакаваў рост цікавасці да рызыковых актываў напярэдадні і на амерыканскіх пляцоўках: Dow Jones — на 2 %, S&P 500 — 1,34 %, Nasdaq — 0,94 %. Тут, відавочна, адыграў ролю эфект станоўчай навіны ў цяжкія часы, адзначае expert.ru. На навіны аб выпрабаваннях вакцыны кампаніяй Moderna звярнулі ўвагу і ў Старым Свеце.

### Дасягненне максімуму насельніцтва Зямлі спрагназавалі да 2064 года



Да такой высновы прыйшлі амерыканскія навукоўцы пад кіраўніцтвам Крыстафера Мюрэя з Вашынгтонскага ўніверсітэта, паведамляецца ў артыкуле, які змешчаны ў навуковым часопісе The Lancet. Паводле разлікаў, у 2064-м на нашай планеце будзе жыць 9,73 мільярда чалавек. Затым колькасць зямлян стане паступова зніжацца: да 2100 года, як прагназуюць навукоўцы, яна складзе ўжо 8,79 мільярда чалавек. Як лічаць навукоўцы, галоўнымі прычынамі такіх дэмаграфічных зменнеяў стане распаўсюджванне адукацыі, перш за ўсё, сярод жанчын, і больш шырокае прымяненне кантрацэпцыі ў краінах Афрыкі, Блізкага Усходу і некаторых азіяцкіх дзяржавах. Менавіта яны пакуль застаюцца лідарамі дэмаграфічнага росту.

### Бэнксі намаляваў пацукоў у лонданскім метро



Сусветна вядомы мастак Бэнксі намаляваў пацукоў з медыцынскімі маскамі ў вагоне лонданскага метро. Відэа акцыі ён выклаў у сябе ў Instagram. На ім ён пад выглядам работніка метро, які быццам бы праводзіць дэзынфекцыю (у рэспіратары, акулярах і ахоўным касцюме), на вачах у рэдкіх здзіўленых пасажыраў наносіць на сцены і вокны вагонаў малюнкі пацукоў, якія чхаюць, пакідаючы брудныя падцёкі, і выкарыстоўваюць ахоўныя маскі. Відэа мастацкай акцыі Бэнксі паглядзела звыш 3 мільёнаў чалавек. Мэта акцыі — заахвоціць людзей насіць ахоўныя маскі ў перыяд пандэміі, што з 15 чэрвеня з'яўляецца абавязковым у грамадскім транспарце і медыцынскіх установах Вялікабрытаніі. Праўда, аператар транспартнай сістэмы Лондана выдаліў графіці. У кампаніі высока ацанілі выражаны ў рабоце заклік і прапанавалі мастаку «зрабіць новую версію свайго паведамлення для нашых кліентаў у адпаведным месцы».

# ПАКАЛЕННЕ «НУ, ПАЧАКАЙ»

Аднойчы злавіла сябе на тым, як часта кажу малым: "Зараз», «Давай потым», «Пачакай тры хвіліны». Злавіла — і напружылася, бо, здаецца, злоўжываю падобнымі выразамі і прыёмамі. Пачала абмяркоўваць тэму са знаёмымі бацькамі, і здалося, што гэта наша агульная рыса — пастаянная нястача часу і, як вынік, спробы «ўвапхнуць неўвапханае» ў абмежаваны перыяд, бясконцае адкладванне на потым і выкананне спраў у апошні момант... Безумоўна, дапамагае штодзённае і перспектыўнае планаванне, аднак, па-першае, дзеці вялікія ўмельцы ўносіць карэктывы ў стройныя схемы, а па-другое, якім бы перфекцыяністам ты ні быў, у сутках усё адно толькі 24 гадзіны і болей не будзе, хоць трэсні.

«Я яму кажу — пачакай, тата заняты, скончу работу і пагуляю з табой, а яму трэба, каб я проста зараз кінуў усе справы і ішоў гуляць у машынкі!» — з абурэннем расказваў адзін тата другому на гульнявой пляцоўцы, як гэта, аказваецца, няпроста — сумяшчаць аддаленую работу і выхаванне дзіцяці. (На гэтым момансе, мяркую, многія мамы і рэдкія таты, якія адбылі ў «дэкрэце», з разуменнем і крыху з'едліва ўсміхнуліся. О, ім ёсць што расказаць пра жыццё ў рэжыме шматзадачнасці, калі, на думку грамадства, у цябе не можа быць ніякіх іншых заняткаў, акрамя догляду дзіцяці, а на думку сям'і, хто дома, той і гатуе, мые, прыбірае і паралельна робіць мноства іншых патрэбных спраў, зашыфраваных у «гэтак далей»!) Але перш чым я нават у думках пачала кпіць у адказ, нечакана запярэчыў другі бацька: «Ну, а што ты хацеў? Ты сам, калі прасіш сяброў дапамагчы з рамонтам, чакаеш іх не на наступны год, а цяпер, калі ў гэтым ёсць неабходнасць. Вось і малому тата патрэбны не калі вызваліцца, а калі душа просіць. Затое ведаеш, якое гэта шчасце, — я дачцэ дапамог з расфарбоўкай, яна абняла за шыю так моцна-моцна і шэпча: «Татачка, я цябе люблю!»

Старэйшыя калегі пішуць — маўляў, усё зло ад гаджэтаў і нашай уласнай нядбайнасці, варта ўдзяляць дзецям больш увагі — і ўсё будзе добра. Канешне, пэўная доля праўды ў гэтым ёсць. Але далёка не ўся. Мае бацькі на адной з вялікіх сямейных пасядзелак, калі іх кватэру разносілі вясёлымі скокамі адначасова шасцёра ўнукаў, прызналіся, што часам не ведаюць, як спраўляцца з прадстаўнікамі пакалення Z — «лічбавымі людзьмі», якія асвойваюць практычна любую тэхніку хутчэй і лягчэй за нас і тым больш бабуль з дзядулямі, аднак губляюцца ў найпрацейшых, здаецца, стасунках з іншымі людзьмі. Яны празмерна самастойныя і самаўпэўненыя, усё выпрабоўваюць на сабе і не будуць «сядзець тут, бо я так сказаў», з імі не спрацоўвае безумоўны бацькоўскі аўтарытэт — трэба тлумачыць, чаму так, а не інакш. Яны ведаюць, чаго хочуць і як гэта атрымаць: «Давай не будзем купляць цукеркі, яны шкодныя для зубоў, а вось у зефірках шмат жалеза і кальцыю, а глюкоза карысная для мозга» — вы яшчэ не чулі падобнага ў краме? Яны нецярплівыя, ненавідзяць сумаваць, і нашы просьбы «ну, пачакай» не могуць выканаць амаль што на фізіялагічным узроўні — проста ў іх іншыя прыярытэты. Затое яны, як правіла, шчырыя і адкрытыя — часам занадта, што шакіруе прадстаўнікоў старэйшага пакалення, але гэта ж дазваляе і наладзіць кантакт з імі — калі не хлусіць, не маніпуляваць, а расстаўляць прыярытэты, тлумачыць і дамаўляцца. «Я дапішу тэкст, тады пойдзем гуляць. Ну як, пачакаеш?» — «Ага. А давай, пакуль я чакаю, адзін адукацыйны мульцік пагляджу». Ой, мама, у цябе ёсць дзесяць хвілін — як казалі героі фільма «Дзелавыя людзі», «паспеем дабегчы да канадскай мяжы!»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

**Выпуск № 13 (149)**


Побач з намі

# «Дзеці кар'еры не перашкода, калі і работа любімая, і дзеці жаданыя»

**Яны пазнаёміліся ў 10-гадовым узросце ў харэаграфічным вучылішчы і з таго часу не расстаюцца**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Спецпраект «СГ»

# АКВАПАРК, КІНО І ПЕРАМОГА НАД ВІРУСАМ

## Пра што мараць нашы дзеці?





Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Новая каранавірусная рэчаіснасць закранула абсалютна ўсе сферы жыцця. І калі ў некаторых выпадках можна было адмяніць, перанесці ці паставіць на паўзу нават важныя справы, то сям'я, як сяброўства, паняцце кругласутачнае. Для многіх сем'яў у свеце меры каранціну і самаізаляцыі, сумяшчэнне аддаленай работы, хатніх спраў і вольнага часу сталі сур'ёзнай праверкай на трываласць, а пра абвастрэнне праблемы гвалту ў сям'і ў гэты час публічна загаварылі нават галівудскія славутасці Анжаліна Джалі і Рыяна...**

**Як маленькія беларусы перанеслі самаізаляцыю, сацыяльнае дыстанцыяванне і іншыя вымушаныя перамены, «СГ» распытала іх саміх. Пяцёра дзяцей намалявалі свае «адкладзеныя мары» — тое, чаго ім найбольш не хапала і што не атрымлівалася зрабіць у цяперашніх абставінах, — а бацькі расказалі больш падрабязна, як падчас пандэміі каранавіруса змянілася жыццё сям'і.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Прававая гасцёўня

# Каханне без пячаткі — шлюб без правоў

***?** Адносіны ў грамадзянскім шлюбе ў нас з маім каханым працягваліся пяць гадоў. Мы былі не распісаныя афіцыйна, жылі ў яго кватэры. За гэты час у складчыну набылі за дзесяць тысяч долараў аўто, машыну афармілі на яго. Зрабілі рамонт у кухні, у які я ўклала свае тры тысячы рублёў. Справа ішла да вяселля, я так думала, бо была цалкам упэўнена ў сваёй палове. Аднак пару месяцаў таму мы разышліся. Цяпер мой былы хлопец адмаўляецца вяртаць мне палову сумы за аўтамабіль і сродкі, якія я ўклала ў рамонт, хоць усё гэта застаецца яму. У мяне засталіся нават некаторыя чэкі як доказ. Ці магу я вярнуць свае грошы і што для гэтага трэба зрабіць?*

**Наталля К., Мінск.**

На пытанне адказвае **Алена СЦЯПАНАВА, адвакат Віцебскай абласной калегіі адвакатаў, старшыня Беларускай лігі сямейных медыятараў, трэнер медыятараў Цэнтра медыяцыі і перагавораў:**

— На жаль, шанцаў атрымаць укладзеныя вамі ў куплю машыны і рамонт кухні грошы амаль няма. Нават калі вы звернецеся ў суд, дабіцца кампенсацыі за патрачанае будзе вельмі складана. Найлепшы спосаб вырашыць сітуацыю ў гэтым выпадку — дамовіцца са сваім былым хлопцам па-добраму.

Заканадаўства гарантуе маёмасныя правы сужэнцаў, якія **знаходзяцца ў зарэгістраваным шлюбе.** Артыкуламі 23, 24 Кодэкса аб шлюбе і сям'і ўстаноўлены рэжым агульнай сумеснай уласнасці ў дачыненні да маёмасці, якая была набыта падчас шлюбу, незалежна ад таго, на чыё імя яна куплялася. **Сумеснае пражыванне без рэгістрацыі шлюбу такіх гарантый не дае,** колькі б гадоў людзі ні пражылі разам. У такім выпадку маёмасць з'яўляецца асабістай уласнасцю таго, на чыё імя яна рэгістравалася.

Калі вы вырашыце звярнуцца ў суд, то трэба быць гатовай да таго, што гэты орган выносіць рашэнне на падставе доказаў. А чэкі — не бясспрэчны доказ. Тым больш што іншы бок, ваш былы хлопец, напэўна ж, будзе аспрэчваць прыналежнасць чэкаў, факт набыцця тых матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся падчас рамонту кухні ў яго кватэры, і іншыя акалічнасці вашага ўнёску ў сумеснае пражыванне. Тым больш што наконт набыцця аўто ў вас увогуле няма ніякіх доказаў, як вынікае з пытання, а паказанні сведак у такіх справах практычна бессэнсоўныя.

Абраўшы шлях дамаўлення, але сутыкнуўшыся з канфліктам з боку вашага былога сужыцеля, варта скарыстацца працэдурай медыяцыі. Нейтральны пасрэднік, медыятар, дапаможа правесці перамовы з мэтай урэгулявання спрэчкі.

Звесткі пра медыятараў можна знайсці на сайтах Міністэрства юстыцыі і арганізацый, якія забяспечваюць правядзенне медыяцый. Таксама з гэтага года ў нашай краіне дзейнічае Беларуская ліга сямейных медыятараў.

Хачу параіць усім, хто лічыць адносіны без афіцыйнага шлюбу больш прымальнымі для сябе, не забывацца на тое, што цягам жыцця могуць паўстаць яшчэ больш сур'ёзныя пытанні накшталт спадчыны, дзяцей і іх выхавання, мноства іншых маёмасных адносін, якія значна прасцей высвятляць у афармленым афіцыйна шлюбе, а яшчэ лепш — пры наяўнасці шлюбнага дагавора.

*Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы.*

Нясумныя канікулы

# СЯМЕЙНЫ ЛЕТАПІС

## Не атрымалася паехаць на мора? Займіцеся складаннем радаводу!

**Колькасць людзей, якія спрабуюць адшукаць свае карані, з кожным годам павялічваецца. Ужо з канца 1990-х людзі схамянуліся, што нічога не ведаюць пра сваіх продкаў, і чытальныя залы архіваў сталі запаўняцца аматарамі і прафесійнымі даследчыкамі, якія працавалі над стварэннем радаводаў. Хтосьці хацеў даказаць, што мае шляхецкае паходжанне, іншыя шукалі польскія ці яўрэйскія карані, а нехта проста жадаў давесці да канца распачатую папярэднікамі справу — адшукаць магілы дзядоў, якія загінулі падчас Першай і Другой сусветных войнаў.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Сёння радавод працуе не толькі на самаідэнтыфікацыю. Людзі разумеюць, што акрамя складання радаводнага дрэва важна захаваць сямейныя гісторыі. Набывае папулярнасць псіхагенеалогія — часам прычыны нашых сучасных няўдач трэба шукаць у гісторыі роду. Напрыклад, даволі часта нашчадкі тых, хто перажыў генацыд ці рэпрэсіі, не могуць дасягнуць поспехаў, заняцца бізнесам: іх выхоўвалі так, каб яны заставаліся незаўважныя, але не сталі ахвярамі. Але пасля таго, як удаецца папрацаваць з генетычнай памяццю і высветліць, адкуль карані праблем, справы такіх людзей пачынаюць ісці ўгору.

Гэтак жа ў гісторыі роду можна чэрпаць падказкі, што рабіць у пэўных сітуацыях — нашы продкі ўжо маглі знаходзіць выйсце з розных праблем — альбо натхняцца дасягненнямі старэйшых пакаленняў.

А хіба мы не капіруем паводзіны нашых сваякоў, іх звычкі, не працягваем традыцыі, якія перадаваліся ад бабуль? Чаму б не паспрабаваць разабрацца ва ўсім гэтым?

Да таго ж вывучэнне радаводу можа быць вельмі захапляльным і павучальным, дапаможа нам лепш зразумець уласныя памылкі. Чаму б не запісаць усё, што было дорага нашым родным і што цешыла нас, і не пакінуць нашчадкам? А калі вашым блізкім давялося пражыць шчаслівае жыццё, знайсці свае падыходы да выхавання дзяцей, узаемаадносін унутры сям'і, а можа, і рэцэпты даўгалецця, як пакінуць без увагі такія набыткі? Самы час узяцца за стварэнне радаводнай кніжкі.

### ФОРМА

Як будзе выглядаць ваша кніга, залежыць толькі ад вашай фантазіі і фінансавых рэсурсаў. На заказ яе могуць зрабіць любога фармату (напрыклад, цяпер папулярнымі становяцца квадратныя кнігі і альбомы), пашчыруюць з дызайнам і інфаграфікай, і нават вокладка можа быць створана пад ваш запыт (хоць скураная, хоць з тканіны, хоць з дрэва). А магчыма, вы здольны самі напісаць і завярстаць кнігу па гісторыі вашага роду і гатовы заплаціць толькі за раздрукоўку і ламінаванне?

Дарэчы, сёння можна знайсці шэраг анлайн-курсаў, дзе вас будуць вучыць, як збіраць звесткі пра сваіх родных, якая інфармацыя спатрэбіцца для кнігі, як праводзіць гутаркі са сваякамі, як прыгожа ўсё апісаць, як зрабіць добрыя здымкі. Многа лекцый і па вёрстцы. Можна проста ўзяць ужо распрацаваныя шаблоны і працаваць з імі або запоўніць гатовую кнігу ўласнаручна сабранымі звесткамі.

Магчыма, вы захочаце аформіць усю сабраную інфармацыю як часопіс і будзеце выкарыстоўваць розныя жанры: змесціце там інтэрв'ю са сваякамі, рэпартаж з месца падзей, навіны, звязаныя з жыццём сваякоў. А калі вы захочаце пазнаёміць з гісторыяй роду дзяцей — можа, наогул лепш падаваць усё як казку ці зборнік апавяданняў, якія знаёмяць з рознымі прадстаўнікамі роду або прысвечаныя якойсьці адной асобе. Маладыя сёння да вяселля замаўляюць кнігі-перавёртышы: з аднаго боку гісторыя роду нявесты, а калі перавярнуць кнігу — пачняце знаёміцца з роднымі жаніха.

### ЗМЕСТ

Наогул, перш чым пачынаць працаваць над сямейнай гісторыяй, важна вызначыць, для каго вы робіце кнігу. Адна рэч, калі вы рыхтуеце яе ў падарунак да юбілею блізкага чалавека: тут вы пакажаце, якое насычанае было жыццё юбіляра, якія людзі былі з ім побач, як многа ён значыць для ўсіх. Зусім іншая — калі вы хочаце пакінуць памяць пра гісторыю сям'і для нашчадкаў. А можа, вы разлічваеце, што гэтую кнігу будуць чытаць жыхары пэўнай вёскі ці гарадка...

Так, у сямейны летапіс можна не толькі заносіць звесткі, хто калі нарадзіўся (памёр) і кім каму даводзіцца. Можна нават правесці цэлае даследаванне, каб разабрацца, якія тайны ці легенды захоўвае ваш род. Або — напісаць, якіх поспехаў і якім чынам удалося дасягнуць вашым сваякам. Якія ў вас ёсць сямейныя традыцыі і ўменні? Можа, у вашым родзе ўсе спяваюць, вяжуць, малююць, вышываюць, робяць выцінанкі ці лепяць гаршкі? Усё гэта таксама вартае таго, каб увайсці ў кнігу альбо быць выкарыстана для яе афармлення. Нават калі бабуля не навучыла вас ткаць, а дзядуля — выразаць з дрэва, варта сфатаграфаваць зробленыя імі ручнікі ці мэблю. А якія пірагі пячэ ваша бабуля? Можна пакрокава зняць увесь працэс іх прыгатавання. Калі ў вас набярэцца сямейных рэцэптаў на некалькі старонак у кнізе — падумайце, як гэта аформіць.

Сямейны альбом — ці не найлепшы ваш дапаможнік. Можна яго даставаць зноў і зноў, і кожны раз бабуля ці дзядуля будзе згадваць усё новыя дэталі з уласнага жыцця, апавядаць пра вашых сваякоў, пра мясціны, дзе яны жылі, пра характары і падзеі. І не забывайцеся зазіраць на адваротны бок фатаграфій — надпісы на іх таксама могуць несці карысную інфармацыю.

Выцягніце сваіх родных на фотасесію. Можна рабіць здымкі самім ці наняць прафесійнага фатографа. Няхай жанчыны дастаюць са старых шаф свае любімыя рэчы. Вы можаце незаўважна для вашых мадэляў уключыць дыктафон і запісаць іх аповеды, звязаныя з усімі гэтымі сукенкамі, спаднічамі, шалікамі, боцікамі. Пытайцеся пра тое, што было модна, дзе вашы бабулі здабывалі прыгожыя сукенкі, што зрабілі ўласнымі рукамі, куды ў іх хадзілі, што надзявалі, калі бегалі на спатканне. Так рэчы дапамогуць вам больш даведацца пра родных, іх узаемаадносіны, пра час, у які яны жылі.

Не забывайцеся і пра іншыя рэчы, якімі карысталіся блізкія. Чаму б не апісаць, як выглядала бабуліна хата, якім рыштункам яна карысталася, калі паліла ў печы, якія кветкі любіла, што расло ў яе садзе-агародзе, якія рэчы захоўваў дзядуля як памяць пра вайну, якая ў яго была прафесія, чаму ён навучыў вас. Ці змяніліся з часам родныя мясціны, як раней выглядала вёска, хто дзе жыў, як адпачывала моладзь, куды хадзілі ў грыбы-ягады, як мясцовыя называлі пэўны лясок, балота, луг. Мікратапаніміка, паданні, казкі з бабулінай, дзядулінай вёскі таксама могуць увайсці ў вашу кнігу. І больш запісвайце за сваімі героямі (дыктафон вам у дапамогу): успаміны, думкі, наказы, пэўная манера гаварыць, дыялектныя словы — усё гэта таксама можа быць цікавае нашчадкам, якім пасля трапіць у рукі ваша кніга... І не бойцеся рытарычных пытанняў — адказы продкаў дапамогуць сфарміраваць важныя паняцці, якія лягуць у сістэму сямейных каштоўнасцяў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Я — СЁМЫ, або Дзядуля ў «дэкрэце»



**Так ужо склалася жыццё, што мне давялося пайсці ў дэкрэтны водпуск (па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трохгадовага ўзросту). Такі варыянт афіцыйна прадугледжаны беларускім заканадаўствам: замест маці даглядаць немаўля можа бацька, бабуля ці дзядуля. (За гэту работу дзяржава яшчэ і грошы плаціць.) У нашай сям'і агульным галасаваннем адказную пасаду матулі-выхавальніцы даверылі мне, ды ў рэшце рэшт ні ў кога іншага такой магчымасці і не было.**

— «Абавязкі мамы» я пачаў выконваць з 1 студзеня 2019 года. На той момант у Беларусі ў «дэкрэце» знаходзілася больш за тысячу бабуль і толькі шэсць дзядуляў. Такім чынам, я стаў у краіне сёмым, а на Ганцаўшчыне — і ўвогуле першым. Многія знаёмыя, даведаўшыся пра маё рашэнне, жартаўліва цікавіліся: ты, маўляў, на якім месяцы цяжарнасці?

Аднак, шчыра прызнаюся, мне тады было не да жартаў. Узваліць на сябе такую адказнасць у шасцідзесяцітрохгадовым узросце — гэта сапраўды няпросты крок. І я доўга вагаўся, пакуль на яго вырашыўся. Сёння ж заяўляю катэгарычна: ніколькі не шкадую пра гэты свой учынак, бо даглядаць, выхоўваць маленькага чалавечка — задача хоць і няпростая, але пачэсная і вельмі прыемная. Гэта ж на тваіх вачах, пры тваім самым непасрэдным удзеле немаўля пачынае пазнаваць свет, станавіцца «на крыло», асэнсоўваць паняцці дабра і зла, зацвярджаць сябе ў навакольным грамадстве. Ты разумееш, што менавіта ад цябе ў многім залежыць, якім ён стане чалавекам.

Але ўсё па парадку. Сашку на пачатку нашых з ім цесных стасункаў споўнілася 1 год 9 месяцаў 12 дзён. Ён ужо ўпэўнена хадзіў па хаце, любіў гуляць з машынкамі, праўда, мала што гаварыў: «дай», «хачу», «мама»... А тут раптам дзед з вусамі! Вось з вусоў ён і пачаў — чапляўся за іх сваімі моцнымі пальчыкамі і тузаў туды-сюды, радасна смеючыся. Адным словам, новая забава з'явілася ў малога. Потым сур'ёзна паглядзеў на мяне і вымавіў: «Дзед!»

Выхаваўчы працэс пачаўся. З усіх бакоў ад сямейнікаў пасыпаліся парады. Хтосьці раіў адразу ўзяць малога ў яжовыя рукавіцы, і дачка пажартавала: «дзедаўшчына», маўляў, пачынаецца; жонка катэгарычна заявіла: караць дзіця нельга ні ў якім разе, крычаць на яго — таксама не. А ўнучак уважліва вывучаў новага выхавальніка — прыкідваў, напэўна, як гэтага старога чалавека самому ўзяць «у абарот». Я, у сваю чаргу, насцярожана назіраў за сваім падапечным — чаго чакаць ад хлопчыка?

Не, не скажу, што займацца з унукамі — справа для мяне ўвогуле незнаёмая. Сашка ўжо шосты ў нашай сям'і. У старэйшай дачкі Алены растуць трое — унук Алёшка і ўнучкі Аня і Марыяна, ды і ў малодшай Юлі Сашка стаў трэцім пасля Уладзіка і Ромкі. Але адна рэч сустракацца з унукамі перыядычна, па святочных днях, а тут жа зусім іншае — кожны дзень. Дваццаць чатыры гадзіны ў суткі. І накарміць, і напаіць, і пагуляць, і спаць палажыць, і, прабачце, на гаршчок пасадзіць. На выхадныя, праўда, дачка яго забірала да сябе ў Брэст — давала дзеду адпачынак. Аднак я хутка прывык да сваіх абавязкаў, і не надта ўжо і патрэбен быў мне той адпачынак.

Хутка прывык да мяне і Сашка. Ён ледзь не з першага дня ўцяміў, што новая нянька не такая ўжо і строгая, і пачаў літаральна вяроўкі з мяне віць. А я і сапраўды на практыцы прымяняў англійскі метад выхавання — дазваляў малому рабіць усё, што ён хоча. Карміў, гуляць вадзіў, спаць укладваў не па прымусе, а тады, калі той прасіў, мульцікі дазваляў глядзець, пакуль яму не надакучвала. Карацей кажучы, дзейнічаў па прынцыпе: чым менш забарон — тым менш спакус. І, дарэчы, хутка заўважыў, як зваротная рэакцыя наступіла, эфект бумеранга, так бы мовіць: ты на дзіця не крычыш — і яно на цябе не крычыць, ты з ім па-добраму — і дзіця з табою па-добраму.

Былі, вядома, у маім метадзе выхавання і забароны. Не без гэтага. Але іх было мала, і яны датычыліся толькі бяспекі. Таму ўнук да іх прыслухоўваўся і заўсёды выконваў. Напрыклад, калі Сашка лез да электрычных прыбораў ці імкнуўся забрацца на падаконнік, я казаў, што так рабіць нельга, бо гэта небяспечна. І ён разумеў — праз нейкі час сам паказваў на акно ці на мікрахвалёўку і казаў: «Небяспечна».

Бабуля, паназіраўшы за «агліцкімі» метадамі дзеда, паспрабавала ўмяшацца: распуста, маўляў. Я ў адказ толькі плячыма паціснуў: не падабаецца — давай сама. Але яна ў нас усё жыццё на кіруючых пасадах працавала, таму прывыкла да каманднага стылю. І адразу ж пацярпела фіяска. Унук бабуліны каманды проста ігнараваў. Калі ж ён не паслухаўся ўказанняў раз, другі, трэці, яна махнула рукой на «агліцкія» метады і перайшла да нашых — шлёпнула малога па мяккім месцы. Той у даўгу не застаўся і... адказаў бабулі тым жа.

Я ж працягваў дзейнічаць сваім спосабам. І, між іншым, мой падапечны паслухмяна выконваў усе мае просьбы і ні разу не забаставаў.

Сашка аказаўся здольным і кемлівым хлопчыкам. Імгненна схопліваў усё новае, любіў маляваць і чытаць кніжкі, імкліва павялічваў слоўнікавы запас, пачаў гаварыць цэлымі фразамі. Нагуляўшыся з раніцы з машынкамі, ён прасіў: «Давай, дзед, будзем займацца». Гэта значыць, што трэба даставаць азбуку і вучыць літары. Першую мы з ім вывучылі літару А, потым маміну літару М, дзядаву Д, бабуліну Б... Праз 15—20 хвілін вучыць літары яму надакучвала, і мы пераходзілі да знаёмства з лічбамі. Першыя пяць — колькі пальчыкаў на адной руцэ — ён запомніў ужо на першым занятку. Да дзесяці вучыліся лічыць крыху больш, але і з гэтай задачай хутка справіліся. На ўроках малявання спачатку вучылі колеры. Гэта справа Сашку вельмі падабалася, і ўжо праз два-тры дні ён беспамылкова называў мне любы колер. Я нарадавацца не мог поспехам малога.

Вядома ж, я разумеў, што перагружаць дзіця вучобай нельга, гэта магло адбіць усякае жаданне вучыцца, таму больш часу мы праводзілі ў гульнях. Асабліва ўнуку падабаліся падарожжы па горадзе (наш дэкрэтны водпуск праходзіў у асноўным у Кобрыне). Традыцыйна амаль штодня, калі дазваляла надвор'е, мы хадзілі з ім да чыгункі і назіралі, як міма праходзілі цягнікі. Сашка хутка навучыўся адрозніваць пасажырскія ад грузавых, лічыць, колькі ў саставе вагонаў, вызначаць, куды цягнік едзе — на Брэст ці на Гомель. Потым ішлі з ім да аўтамагістралі Брэст — Мінск, якая праходзіць праз Кобрын, і вучыліся запамінаць маркі машын: пажарная, міліцыя, пікап, кран, лесавоз... Яшчэ адным аб'ектам, дзе ўнуку падабалася гуляць, стаў сквер воінскай славы, закладзены ў гонар кобрынскіх верталётчыкаў, якія загінулі ў Афганістане. Там на пастаменце стаіць сапраўдны ваенны верталёт — ён цягнуў хлопчыка да сябе, бы магніт. Пасля знаёмства з гэтым помнікам нашы штодзённыя падарожжы пачыналіся ўжо не з чыгункі, а менавіта з верталёта. Я расказваў Сашку пра вінтакрылую баявую машыну, пра людзей, якія на ёй ваявалі і гінулі ў далёкай горнай краіне. Малы ўважліва слухаў. Гэта таксама былі ўрокі. Урокі ваенна-патрыятычнага выхавання.

Увогуле вучоба і гульня ў нас заўсёды перапляталіся: на вучэбных занятках мы гулялі ў вучня і настаўніка, спаборнічалі, хто хутчэй запомніць тую ці іншую літару, слова, лічбу, а ў кожнай гульні я стараўся знаходзіць і навучальны аспект.

...Імкліва ідуць дні, тыдні, месяцы. Сашка размаўляе са мною па-даросламу, часам задае такія пытанні, на якія не адразу і адказ знойдзеш: «Дзед, а як дождж ідзе? У яго ж ножак няма...»; «Адкуль сонца бярэцца?»; «Навошта табе вусы?» Тлумачу, хоць па рэакцыі ўнука адчуваю, што не заўсёды мае тлумачэнні яго задавальняюць. Ну што ж, падрасце — зразумее. На ўсё патрэбен час. А сам сабе думаю: а сапраўды, навошта мне тыя вусы? Ды і дождж як без ножак ідзе, не ведаю...

На зіму мы паехалі з унукам у Брэст. Там — новыя ўражанні. Сашку спадабалася гуляць у Скверы міру на Партызанскім праспекце, дзе акцыянернае таварыства «Савушкін прадукт» абсталявала дзіцячы гарадок. Тут і горкі, і альтанкі, і пясочніца... Сашка адразу палез на самую высокую горку — я нават спалохаўся: раптам зваліцца ўніз. Не, карапуз моцна трымаўся за борцікі і ўпэўнена пераадольваў перашкоды. А мне падумалася: а малайцы «савушкінцы» — такую цудоўную справу зрабілі для мясцовай дзятвы!

Днямі Сашку споўнілася тры гады. Такім чынам, мой дэкрэтны водпуск скончыўся. Заўтра — на работу. І радасна, і сумна адначасова. Радасна — таму што не дарэмна правёў гэты час, нешта даў маленькаму чалавечку. А сумна — развітацца. Не назаўсёды, вядома ж, мы будзем і надалей сустракацца з унукам, праўда, ужо не так часта. Спадзяюся, ён будзе мяне чакаць.

...Учора патэлефанавала дачка. Расказала, што Сашка, прачнуўшыся раніцай, адразу пацікавіўся: «А дзе мой дзед?» У мяне ад гэтых слоў сэрца зашчымела.

**Вячаслаў БУРДЫКА.**

Мамін дзённік

# ДЗІЦЯ — АДКАЗНАСЦЬ БАЦЬКОЎ

«Якія раней дэкрэты былі?» — заўважае бабуля, каля якой Цёмік гойсае туды-сюды на самакаце. «Я свайго ў гадзік пакіну ў хаце, пахаваю нажы, яшчэ што небяспечнае прыбяру, дзверы зачыню, а сама на работу іду», — працягвае яна. Бабулі дзевяноста, і ёй, відаць, цяжка ўявіць, што маладыя маці робяць у хаце з дзецьмі цэлых тры гады. А мне нават падумаць страшна, што было б, каб я пакінула свайго няхай ужо і двухгадовага сыночка аднаго ў чатырох сценах...

Пакуль я раніцай прыводжу сябе ў парадак, Арцёмка падцягне да акна крэсла, падлезе пад занавеску і выглядае, што ж там на двары робіцца. У пошуках цукерак ці іншых прысмакаў аблазіць на кухні ўсе шафкі, паступіцца на табурэт і, нарэшце, усядзецца на стале (а як потым будзе злазіць — справа другарадная). Першым ляціць выключаць чайнік, калі той свічша, і без праблем уключыць святло, калі цёмна. Адным словам, толькі з пункту гледжання бяспекі пакінуць малога аднаго ў хаце рызыкоўна.

Нават уявіць складана, як бы ён сам вылез са свайго ложачка, адзеўся, памыўся, паснедаў. І гэта пры ўсім тым, што, нягледзячы на свае два гадкі, хлопчык у мяне дастаткова самастойны. Адзявацца ён, як і многія дзеці, не любіць, але зубной шчоткай карыстаецца па прызначэнні. І лыжку трымаць умее (ужо нават суп есць сам). Толькі ці паеў бы «правільнай» ежы, калі б застаўся адзін?! Хутчэй знайшоў бы якога пячэння ці ў лепшым выпадку запоўніў бы свой страўнік хлебам ці булкай. Ды і гуляць адзін мой Арцёмка не прывык. Гэта калісьці мне, малой, маці накідае ў ложачак цацак і пойдзе займацца хатнімі справамі — праз некаторы час прыйдзе, а я ўжо сплю. У нас жа, пакуль казку не пачытаеш, Цёмік не засне. І калі прачнецца, трэба, каб нехта быў побач, а то слёз не пазбегнуць.

Адным словам, недарэмна «дэкрэт» прыдумалі. Вядома, ёсць розныя сітуацыі, калі бацькі вымушаны працаваць, а дзіцем займаюцца бабулі ды дзядулі. Маё ж уласнае меркаванне: дзеці — адказнасць выключна бацькоў. Раз яны прынялі рашэнне завесці дзіця, а не коціка, то павінны яго не толькі забяспечваць усім матэрыяльным, а і проста быць побач. Якія б добрыя ні былі бабулі-дзядулі ды іншыя сваякі, больш, чым мама і тата, дзецям ніхто не патрэбен.

Так склалася, что, пакуль я ў дэкрэтным, мы пераехалі да маіх бацькоў. Яны, вядома, займаюцца з Цёмікам. Ды што хаваць, я без іх як без рук! Каб была адна (муж тыднямі ў камандзіроўках), то нічога не паспявала б. Асабліва цяпер, калі Цёмік не паспее прачнуцца, як адразу бяжыць да дзвярэй, абуваецца, нацягвае кепку і кажа: «Пака!» Так бы і гулялі цэлымі днямі, з перапынкам хіба што толькі на дзённы сон. А так пакуль дзед з Цёмікам на вуліцы, я і ў хаце прыбяру, і градку якую апалю, папрасую бялізну. З ядой выручае маці.

За два гады малы вельмі прывык да бабулі і дзядулі. Калі зімой з'язджалі ў невялікі адпачынак, то, вяртаючыся дамоў, ужо з машыны Цёмік задаволена крычаў: «Дзед!» Не паспее адкрыць вочы — бяжыць да іх у пакой, каб бабуля ўключыла мульцікі. Але ўсе патрэбны яму да пары. Як толькі з рэйса вяртаецца бацька, на любыя спробы бабы і дзеда пагуляць з ім Арцём кажа кароткае «не лезь!» Яны не крыўдуюць, бо разумеюць, што маці і бацьку дзіцяці ніхто ніколі не зможа замяніць.

У гэтым плане я вельмі шкадую малых, маці якіх ахвяруюць дэкрэтным адпачынкам і выходзяць на работу ці займаюцца ўласнымі справамі. Ды не той узрост у бабуль ды дзядуляў (у прыватнасці, у Цёмавых), каб бегаць за малым, які, што метэор, ганяе на самакаце ды на сваіх дваіх, і сачыць, каб не ўпаў, калі ён, нібы той папрыгунчык, скача на батуце. Яны самі прызнаюцца, што сваіх дзяцей гадаваць было лягчэй. З унукам жа — двайная адказнасць. Калі, не дай бог, з малым здарыцца непрыемнасць, безумоўна, яны будуць вінаватыя.

У нас, бацькоў, адказнасць не меншая. За гэтыя тры гады мы павінны вырасціць больш-менш самастойнага чалавека. Каб у дзіцячым садку лыжку над ім ніхто не трымаў, памперсы (а бывае і такое!) ніхто не мяняў, каб малое магло само адзецца і раздзецца, больш-менш умела выказаць свае жаданні. І калі, замест таго каб пачытаць з дзіцем кнігу альбо размаляваць (няхай абы-як!) якую карцінку, маладая матуля пры любой магчымасці совае яму ў рукі гаджэт, а сама ў лепшым выпадку займаецца сваімі справамі альбо зависае ў іншым смартфоне, то наўрад ці ў яе падрасце больш-менш самастойны чалавечак. Вось тады сапраўды паўстае пытанне: што гэтая маці рабіла тыя «доўгія» тры гады?!

**Вераніка КАНЮТА.**

# АКВАПАРК, КІНО І ПЕРАМОГА НАД ВІРУСАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## ЗЛАТА

«Яшчэ ўвесну нашы дзеці перасталі наведваць садок, але муж працягваў хадзіць на работу, ды і я, хоць «з жыватом», таксама працавала, хіба толькі зменшылася колькасць індывідуальных заняткаў, а трэніроўкі па фітнесе збольшага праводжу ў Zoom, — дзеліцца гераіня адной з колішніх публікацый «СГ», сацыяльны педагог, псіхолаг і фітнес-трэнер **Святлана Нямірка.** Паводле яе слоў, сям'я не сыходзіла ў самаізаляцыю, але прытрымлівалася сацыяльнай дыстанцыі — звяла да мінімуму паходы ў краму, адмовілася ад наведвання месцаў масавага збору людзей.

У старэйшай дачкі змяніўся рэжым у спартыўных гуртках — сінхроннае плаванне на няпэўны тэрмін паставілі на паўзу, скарацiліся заняткі танцамі і канькамі, а англійскую давялося працягваць вучыць анлайн. «Паколькі ў нас вельмі актыўная сям'я, то для нас гэта было не выпрабаванне, а хутчэй магчымасць больш часу бавіць усім разам, і гэта, безумоўна, пайшло на карысць: мы не сварыліся адно з адным, а сталі яшчэ бліжэйшыя, — усміхаецца без пяці хвілін шматдзетная маці. — Дзесьці з мая мы вярнуліся да больш-менш звыклага рытму жыцця, пачалі наведваць бабулю — маю маму, займацца фігурным катаннем, так што, мне здаецца, дзеці не адчулі сацыяльнай ізаляцыі».

Але гэта пазіцыя дарослых — цікава, ці супадае яна з дзіцячым поглядам? У адказ на пытанне, пра што яна марыла ў гэтыя месяцы, 6-гадовая Злата Нямірка намалявала нам цырк і кіно. Зразумела, ні туды, ні туды ў цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі сям'я не хадзіла. «Белдзяржцырк, наколькі я помню, спыніў прадстаўленні яшчэ ў сакавіку, а вось ад кіно Злата не адмовілася б, — разважае мама. — Хоць, па шчырасці, не думаю, што гэта ў яе галоўныя мары: проста не спыталі «чаго табе не хапае», і яна намалявала першае, аб чым у той момант падумала».

## БРАЧЫСЛАЎ

Сям'я **Яўмененкаў** таксама не сыходзіла ў ізаляцыю, бацька працягваў ездзіць на работу. Вырашылі, што з дзецьмі нельга сядзець у чатырох сценах, — таму па магчымасці не наведвалі дзіцячы садок, больш выязджалі на прыроду, у тым ліку на базы адпачынку. «Мы мінімізавалі кантакты — не ездзілі да бабулі і дзядулі, не наведвалі дзіцячыя цэнтры, гульнявыя пляцоўкі, паркі і іншыя забаўляльныя прасторы, а ў крамы і гандлёвыя цэнтры ездзіў муж, — расказвае мама Іна. — Канешне, было відаць, што дзеці вельмі сумуюць па родных, і калі праз чатыры месяцы мы вырашыліся сустрэцца з бабуляй, абодва бакі былі ўсцешаныя, толькі што малыя ўдакладнялі: «А ў вас няма каранавіруса?» Яны малайцы, яны ў тэме і разумеюць, што мыць рукі, «пшыкаць» дэзінфіцыруючымі сродкамі — гэта неабходнасць, часам нават мне нагадваюць».

Брачыслаў Яўмененка на пытанне, чаго яму найбольш не хапае, намаляваў няспраўджаную пакуль мару — аквапарк з разнастайнымі горкамі. Справа ў тым, што летась сям'я адпачывала ў Букавелі, і там малы так натхніўся ўсесезонным басейнам пад адкрытым небам, што выпатрабаваў з бацькоў абяцанне абавязкова наведаць аквапарк у Мінску. «Я ведала, што ён намалюе менавіта гэта, яшчэ да таго, як на аркушы з'явілася першая лінія, — уздыхае Іна, — бо аквапарк для Брачыка — мара нумар адзін. На жаль, з яе здзяйсненнем пакуль давядзецца пачакаць».




## КАЦЯ

«На пэўны час наша жыццё стала вельмі сумным з-за абмежаванняў кантактаў з роднымі і сябрамі і адмовы ад масавых мерапрыемстваў, але мы стараліся кампенсаваць гэта, часцей бываючы на свежым паветры, — разважае Алена, мама 7-гадовай **Каці Барысёнак**. — Сямейны адпачынак дзесьці за мяжой мы не планавалі, таму ў гэтым сэнсе ўціскаць сябе не давялося. А чаго не хапала асабіста Каці, давайце спытаем яе саму. Тым больш, скажу па сакрэце, гэта яе мара нядаўна збылася».

— Я намалявала гандлёвы цэнтр «Карона-Сіці», проста вельмі хацела ў забаўляльны цэнтр «Базіліён», які там змешчаны, — прызнаецца Каця Барысёнак. — Раней ужо была там, але даўно, і ўсё так спадабалася — і шарыкавы басейн, і батут, і горкі, і нават гарматы ёсць, з якіх можна шарыкамі страляць... І вось нядаўна маме тэрмінова трэба было ў «Карону», і я ўгаварыла пайсці ў «Базіліён». Хоць дзяцей было мала, але там так крута! А хутка мы паедзем у вёску і возьмем з сабой Фільку (гэта наш сабака, ён яшчэ малы, яму толькі год, і ў яго такая забаўная пыска!). Калі прыедзем, я прыдумала, як адзначыць Хэлоўін ці іншае якое-небудзь свята, — у мяне ёсць цукеркі, буду іх раздаваць. Яшчэ хочацца з'ездзіць пакупацца на возера, калі надвор'е дазволіць. Гэтым летам я ўжо купалася, ездзіла з маім сябрам і аднакласнікам, але калі тое было, — дзяўчынка энергічнай хуткамоўкай пералічвае столькі планаў на лета, што мы толькі паспяваем здзівіцца, як многа трэба паспець чалавеку паміж першым і другім класамі школы, і пазычыць здзяйснення гэтых няхітрых, але такіх важных дзіцячых жаданняў.




## МАКАР

У **Новікавых** трое сыноў: аднаму чатыры, другому шэсць, трэцяму адзінаццаць гадоў, і справіцца з хлопцамі бывае вельмі няпроста. Таму ў свой час у сям'і прынялі рашэнне, што паміж работай і домам мама выбірае дом, вядзенне хатняй — загараднай — гаспадаркі і догляд дзяцей. З абвастрэннем эпідэміялагічнай сітуацыі сям'я сышла ў ізаляцыю, тым больш умовы гэта дазвалялі. «Муж з сакавіка працуе ў аддаленым рэжыме, малодшыя дзеці не наведвалі садок, таму мы вырашылі, што і старэйшага сына, пяцікласніка, пакінем дома — нічога страшнага, калі будзе атэставаны па трох чвэрцях, — расказвае мама Вольга. — Наша школа аператыўна адрэагавала на сітуацыю: дзеці кантактавалі з настаўнікамі праз «Вайбер», выконвалі заданні, а ў клас хадзілі ўсяго пяць чалавек. Безумоўна, калі ўсе дома, размежаваць асабістую прастору складана — добра, што нам, у адрозненне ад гараджан, ёсць куды падзецца: побач лес, два возеры, можна сесці на веласіпеды і выправіцца на шпацыр, каб не перашкаджаць тату працаваць... У стасунках са старэйшымі сваякамі таксама вытрымлівалі дыстанцыю: замаўлялі бабулі з дзядулем дастаўку прадуктаў, кантактавалі анлайн і ўбачыліся толькі напрыканцы чэрвеня.

Дзеці, кажа Вольга, трымаліся годна: хоць і відавочна перажывалі гэту аддаленасць, аднак разумелі, што павінны пасядзець дома, каб зменшыць рызыку заражэння. І ўсё ж — натуральна, ім не хапала стасункаў з сябрамі. Таму на малюнку 6-гадовага Макара — рознакаляровыя шарыкі як кранальны сімвал выпускнога ранішніка ў дзіцячым садку. На жаль, з-за каранавіруса гэтае свята, якога хлопчык вельмі чакаў, не адбылося. І хоць у жніўні бацькі ўжо былых выхаванцаў садка дамовіліся сустрэцца, каб зрабіць сумеснае фота і ўручыць дзецям падарункі, — але наўрад ці атрымаецца стварыць тую самую атмасферу ўрачыстасці і светлага суму...



## СТЭФАНІЯ ЛЮБОЎ

«Наша прафесія дазваляе шмат чаго рабіць дыстанцыйна, — кажа журналіст, рэдактар **Вольга Хвоін.** — А вось з бабуляй, якая жыве недалёка, мы практычна не бачыліся з сакавіка, дый сябе пастаянна кантралявалі ў плане мыцця і апрацоўкі рук. Не скажу, каб мы вельмі пакутавалі ад немагчымасці выехаць кудысьці за мяжу, але ў такія моманты, як цяпер, пачынаеш разумець, наколькі каштоўна насамрэч, калі можаш сесці на цягнік і паехаць у іншую краіну, паглядзець на жыццё іншых людзей... Затое з'явілася шмат часу, каб пабыць побач з сям'ёй. Дачку я настолькі замучыла заняткамі, што яна аднойчы заявіла: «Хачу, каб вірус скончыўся, ты хутчэй пайшла на работу і не тэрарызавала мяне прапісам ды чытаннем!»

Пэўна, менавіта гэта 7-гадовая Стэфанія Любоў Клімчык хацела паказаць у сваім малюнку — каранавірус і жанчына ў масцы. Дзяўчынка ўдасканальвала і перараблява сваю работу некалькі разоў, каб быць зразумелай. «Яна шмат распытвае мяне пра навіны ў свеце і разумее, што каранавірус — тая з'ява, якая закранула ўсю планету, адбілася на жыцці мільёнаў людзей, — раскрывае мама пасыл юнай мастачкі. — І, канешне, марыць, каб усё гэта хутчэй скончылася».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# «Дзеці кар'еры не перашкода, калі і работа любімая, і дзеці жаданыя»


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Адна з самых прыгожых балетных і моцных сямейных пар Вялікага тэатра — заслужаная артыстка Беларусі Юлія ДЗЯТКО і народны артыст Беларусі Канстанцін КУЗНЯЦОЎ — валодае выдатным пачуццём гумару. Кожны іх дзень распісаны па хвілінах, але, здаецца, толькі ў такім тэмпе яны і ўмеюць жыць. Іх старэйшая дачка Аня вырасла ў тэатры і цяпер вучыцца ў харэаграфічным каледжы. Юлія і Канстанцін у многіх спектаклях занятыя як балетмайстрыпастаноўшчыкі. На рэпетыцыі Юля прыходзіла, калі малодшая дачушка яшчэ ляжала ў люльцы. Магчыма, і яна працягне балетную дынастыю.**

***— У Вялікім пра вашу пару сказалі: яны вельмі падыходзяць адно аднаму як танцоры. А што было першае: з дуэта танцораў вы сталі парай ці наадварот?***

**Юлія:** — Тут усё само неяк атрымалася. У харэаграфічным вучылішчы мы вучыліся ў адным класе, так што знаёмыя з дзяцінства. І на занятках нас у пару ставілі ўвесь час, бо мы падыходзілі адно аднаму па росце. На справаздачным канцэрце танцавалі разам і ў тэатр паступілі як пара. А адносіны паралельна развіваліся. Так што ўсё ўзаемазвязана ў нас.

***— Колькі вам было гадоў, калі стварылі сям'ю?***

**Канстанцін:** — Ой, даўно! *(Усміхаецца.)* Ужо і не памятаю! Жартую. Нам акурат па дваццаць гадоў было. А перад тым дзесяць гадоў прыглядаліся адно да аднаго.

***— Як вы ставіцеся да так званых выпрабавальных шлюбаў, калі людзі жывуць разам, але не спяшаюцца ў загс?***

**К.:** — Асабіста я не бачу ў гэтым праблемы. Калі людзі пажывуць разам, прытруцца адно да аднаго і ўжо свядома пойдуць пячатку ў пашпарт ставіць — гэта ж лепш, чым наадварот: хуценька распісацца, а потым аказацца, што ён храпе! *(Разам смяюцца.)*

***— Вядомы такі стэрэатып: кар'ера балерыны і нараджэнне дзіцяці несумяшчальныя. Напэўна, ён навеяны біяграфіямі Маі Плісецкай, Галіны Уланавай. Але ёсць і іншыя прыклады: у Ніны Ананіяшвілі двое дзяцей, у вашай калегі Ірыны Яромкінай — трое. Звычайныя людзі, перш чым заводзіць дзяцей, арыентуюцца на сваё фінансава-бытавыя магчымасці. У балетных усё складаней... Юля, цяжка было выбраць час для паўзы ў кар'еры, каб стаць мамай?***

**Ю.:** — Калі нарадзілася Аня, кар'ера ў мяне ўжо склалася. Быў і рэпертуар, і статус у прафесіі. Вядома, адмовіцца ад сцэны, хай і на час, балерыне цяжка. Таму гэта быў свядомы крок. А Віка з'явілася на свет, калі я ўжо пакінула сцэну, тут усё прасцей было. Якія б у каго ні былі стэрэатыпы, магу дакладна сказаць: дзеці кар'еры не перашкода, калі і работа любімая, і дзеці жаданыя. Ну і здароўе, вядома, каб дазваляла ўсё гэта спалучаць.

***— Юля, вы раней завяршылі кар'еру салісткі балета, а Канстанцін працягвае працаваць і як вядучы майстар сцэны. Не раўнуеце да партнёрак?***

*Ю.:* — Работа з іншымі партнёрамі ў тэатры — норма. Хоць мы пратанцавалі парай усю кар'еру, але часам нам і з іншымі партнёрамі даводзілася выступаць. Гэта частка прафесіі. Існуюць чаргавасць спектакляў і амплуа. Для розных спектакляў патрэбныя розныя выканаўцы, з розным тэмпераментам або знешнімі данымі, напрыклад. І забараняць адно аднаму працаваць з іншымі выканаўцамі неразумна.

***— У вашых дачок вялікая розніца ва ўзросце. Як яны ладзяць паміж сабой?***

**К.:** — Ганне пятнаццаць гадоў, а Віцы амаль два. І, вядома, старэйшай бывае цяжкавата з Вікай. Ёй хочацца больш самастойнасці і свабоды ад бацькоўскага прыгнёту. Але, калі трэба, Аня няньчыць Віку — і пагуляе, і накорміць яе.

***— Канстанцін, паступіўшы ў Мінскае харэаграфічнае вучылішча, з 10 гадоў вы жылі ў інтэрнаце навучальнай установы, адзін,***



***у чужым горадзе (Канстанцін Кузняцоў родам са Смаленска. — Аўт.). Як вы спраўляліся з побытам, і ці дапамагае той вопыт у сямейным жыцці? Ці ёсць у вас у сям'і нейкі падзел абавязкаў, хто мые посуд, хто гуляе з сабакамі?***

*К.:* — Ні секунды не пашкадаваў, што столькі часу пражыў у інтэрнаце. Таму што гэта было вельмі цікава. Новы вопыт. І арганізавана ўсё было вельмі добра ў нас. Выдатныя выхавацелі дапамагалі дзецям адаптавацца і ў побыце, і ў вучобе. А ад хатніх абавязкаў у нас ніхто не адвільвае! Толькі Юля гатуе часцей, бо ў яе смачней атрымліваецца. Яна наогул суперкухар! Цяпер мы на рабоце, значыць, Аня выгуляе сабак. І наадварот, Аня на занятках — я бягу дадому. Вядома, з Вікай асноўны час праводзіць Юля, таму што малая цалкам ад мамы залежыць. Але і тут мы стараемся адно аднаго разгружаць. І бацькі Юліны вельмі дапамагаюць.

***— Стараецеся Аню вызваляць ад хатніх спраў, бо ў яе вельмі вялікая нагрузка ў харэаграфічным каледжы?***

**Ю.:** — Нагрузка сапраўды вялікая. Часам мы ўжо дома, а Аня яшчэ ў каледжы. Але, тым не менш, у Ані ёсць кола абавязкаў, якія яна выконвае. І ўрокі зрабіць, і прыбрацца ў пакоі. Часам і прыгатуе штосьці, у краму забяжыць, калі мы не паспяваем.

***— Вы ведаеце, колькі кожны з вас зарабляе? Як у сям'і арганізавана кіраванне фінансамі?***

**К.:** — З фінансамі ў нас усё вельмі празрыста. У каго ў канкрэтны момант на картцы больш грошай, той і аплачвае рахункі. А так — усе выдаткі дзеляцца пароўну паміж членамі сям'і. Усё, што ўдаецца зарабіць, ідзе ў агульны кацёл.

***— Як вы праводзіце адпачынак?***

**Ю.:** — Звычайна стараемся кудысьці з'ездзіць, да мора дзяцей вывезці. Тут, вядома, і ад фінансавага складніку многае залежыць. У гэтым годзе пандэмія сапсавала лета, але, можа, атрымаецца нешта прыдумаць, каб добра адпачыць.

***— У вас унікальная прафесія: у 18 гадоў вы ўжо спецыялісты, у той час як аднагодкі толькі першы курс ВНУ скончылі. Ці не значыць гэта, што артысты балета хутчэй сталеюць, пазбаўленыя пэўных радасцяў юнацтва-маладосці, і калі так, то ці можна гэта нагнаць, скажам, гадоў да 30?***

**К.:** — Артысты балета — тыя яшчэ дзеці. *(Усміхаецца.)* Вядома, прафесія наша з ранніх гадоў прывучае чалавека да дысцыпліны, да парадку, раскладу і цярпення. Без гэтага ніяк. Але я б не сказаў, што балетныя артысты нечым абдзеленыя. Проста трэба навучыцца запіхваць больш спраў у дваццаць чатыры гадзіны!

***— Цяпер да сям'і не ва ўсіх трапяткое стаўленне, як спяваецца ў вядомай аперэце: «Нонче без волокит, лишь перо заскрипит, и свободными станем мы снова». На якіх каштоўнасцях трымаецца ваша сям'я і што з гэтага вы хацелі б перадаць у спадчыну сваім дзецям?***

**К.:** — Вельмі хацелася б перадаць дзецям замак у Баварыі, але ў нас яго няма! *(Сумна ўсміхаецца.)*

**Ю.:** — Каштоўнасці... Тут усё проста. Павага адно да аднаго. Дрэнна табе ці добра — ты ведаеш, што заўсёды ёсць месца, дзе цябе выслухаюць, зразумеюць і дапамогуць. Гэта і ёсць сям'я.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

**Здымкі дадзены прэс-службай Вялікага тэатра Беларусі.**


**Юля носіць на руках Канстанціна толькі на сцэне.**



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

### извещает о проведении 20 августа 2020 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Ребрище, У-1, кадастровый номер 623286307601000079 | 0,1461 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение | 5 000,00 | 500,00 | 2060,97 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д. Ребрище, У-8, кадастровый номер 623286307601000074 | 0,1100 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение | 4 500,00 | 450,00 | 2196,87 + расходы за размещение объявления |
| 3 | д. Ребрище, У-12, кадастровый номер 623286307601000076 | 0,1145 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение | 4 500,00 | 450,00 | 2082,34 + расходы за размещение объявления |
| 4 | д. Ребрище, У-3, кадастровый номер 623286307601000080 | 0,1005 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение | 5 000,00 | 500,00 | 1879,96 + расходы за размещение объявления |
| 5 | аг. Острошицы, У-3, кадастровый номер 623286306601000597 | 0,1062 | Черта населенного пункта Имеются сети: электрификация, водоснабжение, газификация | 13 000,00 | 1 300,00 | 1904,67 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 20 августа 2020 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет, контактные телефоны**: 8 (01774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 6613988.**

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 14.08.2020 включительно;

**Для участия в аукционе необходимо:**

1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;

2) представить квитанцию об уплате суммы задатка;

3) представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

4) заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X УНН 600537220 код платеж 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Гостиница «Могилев», 19 августа 2020 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., коп. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб., коп. | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-154726, общей площадью 126,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Мира, 6-8** | 351 600 руб. 00 коп. | 17 580 руб. 00 коп. | Наименование – изолированное помещение № 8, назначение – помещение неустановленного назначения. Помещение расположено на 2-м этаже здания гостиницы «Могилев». Стены – кирпичные, железобетонные; перегородки – кирпичные; перекрытия – железобетонные; полы – паркет, линолеум; проемы оконные, дверные – ПВХ-профиль. Имеются центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, горячее водоснабжение | без условий |

**Аукцион состоится 19 августа 2020 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.**
Заявки принимаются ежедневно с 16 июля 2020 г. в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 17 августа 2020 года до 17.00**. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона – **19 августа 2020 года** с 14.00 до 15.00

**Продавец: ОАО «Гостиница «Могилев», 212030, г. Могилев, пр-т Мира, 6, тел.: (80222) 72-42-91, 72-41-45.**

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны: (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.**

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Гостиница «Могилев».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность;
- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона в установленном порядке в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Условия и порядок оплаты – оплата стоимости предмета аукциона, приобретенного на аукционе, производится путем перечисления денежных средств на текущий (расчетный) банковский счет продавца в полном размере в течение 10 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи объекта недвижимости.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8.00 до 17.00, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона** – в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона,** – в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона –** в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (0222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Булочно-кондитерская компания «Домочай», 19 августа 2020 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., коп. (без учета НДС) | Размер задатка, бел. руб., коп. | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инвентарным номером 722/С-3937, общей площадью 18,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724255100001000356, по адресу: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. Круглое, ул. Лермонтова, 29.** | 8 800 руб. 00 коп. | 440 руб. 00 коп. | Наименование – здание торгового павильона, назначение – здание специализированное розничной торговли. Здание 2005 г. постройки. Фундамент – бутобетонный, стены – блочные, сборно-щитовые, укреплены металлическим уголком; перегородки – дощатые; перекрытия – деревянные полы – бетонные, линолеум, кровля – асбестоцементный волнистый лист, стропильная система, проемы оконные – деревянные одинарные, металлическая решетка, дверные – металлические. Имеется электроснабжение | без условий |

**Аукцион состоится 19 августа 2020 года в 12.00 в здании Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**
Заявки принимаются ежедневно с 16 июля 2020 г. в рабочие дни – с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 17 августа 2020 года до 17.00**. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона – **19 августа 2020 года** с 11.00 до 12.00

**Продавец: ОАО «Булочно-кондитерская компания «Домочай», 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 39а, тел. 8-0222-76-75-73.**

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны: (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.**

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Булочно-кондитерская компания «Домочай».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность:
- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

